БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 21 снежня 2007 года, № 19–20 (1970–1971)




## ЛАЎРЭАТЫ ПРЭЗІДЭНЦКАГА ФОНДУ

65 студэнтаў і 1 выкладчык БДУ ўзнагароджаны стыпендыямі і прэміямі Савета Спецыяльнага фонду Прэзідэнта краіны па сацыяльнай падтрымцы адораных студэнтаў. Матэрыяльная дапамога ў памеры 9 млн руб. аказана таксама і студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі "Фізіка-хімічныя параметры рэчываў і працэсаў". Распараджэнне аб гэтым кіраўнік дзяржавы падпісаў 19 снежня.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### ПАДЗЕІ

## ПАКЛАПОЦІМСЯ ПРА ДЗЯЦЕЙ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце 14 снежня адбылася прэзентацыя Цэнтра перспектыўнага дзяцінства, створанага пры падтрымцы Дзіцячага фонда ААН (ЮНІСЭФ) у Рэспубліцы Беларусь.**

У цырымоніі ўдзельнічаў рэктар БДУ Васіль Стражаў, прадстаўнік арганізацыі ЮНІСЭФ у Беларусі Броніслаў Екіч, а таксама прадстаўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў нашай краіны. Узначаліла Цэнтр Алена Усціненка. Яго дзейнасць накіравана на падрыхтоўку будучых бацькоў-студэнтаў да сямейнага жыцця, усвядомленага выканання абавязкаў маці, бацькі, сужэнцаў.

У рамках новай структуры універсітэта будзе ажыццяўляцца ўхвалены ўрадам Беларусі праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Стварэнне мадэлі фарміравання ўсвядомленага бацькоўства", які прадугледжвае правядзенне сацыялагічных апытанняў сярод студэнтаў, семінараў-трэнінгаў, факультатываў, круглых сталоў, дыспутаў; выданне буклетаў, брашур, газеты "Счастливая семья"; стварэнне сайта.

Цэнтр будзе супрацоўнічаць з факультэтамі БДУ, іншымі ВНУ, органамі ўлады і грамадскімі арганізацыямі. У красавіку 2008 года пройдзе I Міжнародны круглы стол, у рабоце якога прымуць удзел прадстаўнікі розных айчынных і замежных арганізацый, а таксама цэнтраў дзяцінства, створаных пры вядучых універсітэтах Вялікабрытаніі і Расіі.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

## ЛІЦЭЙ ПАЦВЕРДЗІЎ СВАЮ ЯКАСЦЬ

***Ліцэй БДУ ў другі раз стаў лаўрэатам урадавай прэміі ў галіне якасці***

6 снежня ў Палацы Рэспублікі ўзнагароду кіраўніцтву установы ўручыў намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў.

Конкурс на гэту прэмію праводзіцца з 1999 года ў рамках Дзяржаўнай праграмы "Якасць". У адпаведнасці з палажэннем аб прэміі, пераможцы павінны пацвердзіць сваё званне праз тры гады. Ліцэй БДУ, які ўпершыню быў ганараваны ў 2004 годзе, выдатна з гэтым справіўся.

Ліцэй БДУ з'яўляецца эксперыментальнай пляцоўкай па апрабацыі арыгінальнай мадэлі старшай ступені школы і ажыццяўляе дзейнасць па ўласных вучэбных планах. Адной з асаблівасцяў з'яўляецца тое, што нашы навучэнцы займаюцца пяць дзён на тыдні. Замест урокаў у суботу ліцэісты могуць наведваць курсы па выбары, спартыўныя секцыі, творчыя гурткі, а то і паехаць дамоў. Далей плануем атрымаць сертыфікат міжнароднага стандарту ISO 9000-9001, які дагэтуль не мае ніводная айчынная навучальная ўстанова.

**Таццяна КАЛЕВІЧ,**
**дырэктар Ліцэя БДУ**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**СПЕЦЫЯЛІСТЫ-ФІЗІКІ НЕАБХОДНЫ ВА ЎСІХ СФЕРАХ ЖЫЦЦЯ**
**З даклада дэкана фізічнага факультэта Віктара АНІШЧЫКА**
**Стар. 2–3**

**НАЙЛЕПШЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ПРАЕКТ–2007**
**Аб выніках штогадовага конкурсу ў БДУ**
**Стар. 6**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

НА СХОДЗЕ прадстаўнікоў працоўнага калектыву БДУ, які адбыўся 14 снежня, створана пярвічная арганізацыя Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь". Узначаліў яе рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Васіль Стражаў.

ЮБІЛЕЙНЫ пленум Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства «Веды»", прысвечаны 60-годдзю з дня заснавання гэтай арганізацыі, прайшоў 21 снежня ў Ліцэі БДУ. Узначальвае Беларускае таварства "Веды" рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ брала ўдзел у сусветнай канферэнцыі інстытутаў імя Канфуцыя, якая адбылася ў Пекіне. Сёння ў свеце працуе больш за 200 такіх устаноў. У Белдзяржуніверсітэце падобная структура створана год таму.

ПРАДСТАЎНІКІ Ханьчжоўскага універсітэта электронікі наведаюць БДУ з 21 па 25 снежня. Яны правядуць перамовы з кіраўніцтвам Белдзяржуніверсітэта, азнаёмяцца з працай фізічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі.

ПАГАДНЕНЕ аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі паміж БДУ і Харбінскім політэхнічным універсітэтам было падпісана 6 снежня прарэктарам нашага універсітэта прафесарам Віктарам Самахвалам і старшынёй Савета адной з буйнейшых кітайскіх ВНУ прафесарам Го Дачэнам.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ПАЎДНЁВААМЕРЫКАНСКІЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

***Дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым удзельнічала ў рабоце Нацыянальнай выставы Беларусі, якая паспяхова прайшла на пачатку снежня ў сталіцы Вэнесуэлы Каракасе.***

На стэндзе Міністэрства адукацыі сярод іншых экспанаваліся навукова-тэхнічныя дасягненні вучоных БДУ. Былі прадстаўленыя мікрахвалевая тэхналогія перадпасяўной апрацоўкі насення (вынаходцы – вядучыя супрацоўнікі НДІ ЯП Валянціна Радыёнава і Віктар Карповіч) і карпаратыўная геаінфармацыйная сістэма мап-менеджэр для рэгіёнаў, дзе дабываюцца карысныя выкапні (аўтар – прафесар Міхаіл Жураўкоў), камплект па ачыстцы вады (распрацоўшчык – загадчык лабараторыі НДІ ФХП доктар хімічных навук Дзмітрый Грыншпан). Апошнюю распрацоўку Васіль Стражаў асабіста прадэманстраваў прэзідэнтам абедзвюх краін – Аляксандру Лукашэнку і Уга Чавесу, і яна вельмі зацікавіла кіраўніка Венесуэлы, які нават заявіў аб магчымасці заключэння кантракта на вытворчасць дадзенага прадукту.

Акрамя таго, рэктар БДУ падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі і навукі з кіраўніком Нацыянальнага эксперыментальнага універсітэта імя Сімона Радрыгеса (UNESR) Мануэлем Марына Мюллерам. Іх сустрэча прайшла ў даволі незвычайных абставінах – на вышыні 3700 м на адлегласці 1200 км ад Каракаса ў г. Мукучыес (штат Мэрыда), дзе якраз адкрываўся філіял UNESR.

Васіль Стражаў высока ацэньвае патэнцыял новага партнёра. Нацыянальны эксперыментальны універсітэт імя Сімона Радрыгеса заснаваны ў 1974 г. і арыентаваны на шчыльную сувязь з вытворчасцю і рынкам працы. Тут вядзецца шматпрофільная падрыхтоўка кадраў з шырокім выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. Адметнасць ВНУ – у надзвычай дэцэнтралізаванай структуры. Яна мае 20 філіялаў, кожны з якіх развівае спецыфічны кірунак, звязаны з тэрытарыяльна-гаспадарчымі асаблівасцямі таго ці іншага рэгіёну. Усе гэтыя падраздзяленні знаходзяцца на самафінансаванні і валодаюць шырокай адміністрацыйнай аўтаноміяй. Асноўнымі спецыяльнасцямі ў навучальным працэсе з'яўляюцца арганізацыя сістэмы кіравання, матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы, англійская мова, дашкольнае выхаванне, матэматыка, інфарматыка, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, гандаль. Агульная колькасць навучэнцаў, якія атрымліваюць самую


*Рэктар Васіль Стражаў дэманструе экспазіцыю БДУ Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку і Прэзідэнту Венесуэлы Уга Чавесу*

розную адукацыю ў гэтым універсітэце, – больш за 150 тыс. Такая лічба абумоўлена тым, што UNESR спалучае ў сабе рысы класічнай ВНУ, цэнтра павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў і народнага універсітэта з шырокімі асветнымі функцыямі.

Пагадненне разлічана на 5 гадоў. Ва ўмовах развіцця інтэнсіўных міждзяржаўных стасункаў, па словах рэктара, ёсць усе падставы лічыць, што кантакты будуць умацоўвацца.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

**Пасяджэнне Вучонага савета БДУ пройдзе 22 снежня. З дакладам на тэму "Арганізацыйна-выхаваўчая работа, вольны час і ўмовы пражывання студэнтаў у інтэрнатах" выступіць прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце Уладзімір Сувораў. Пачатак у 10.15.**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# СПЕЦЫЯЛІСТЫ–ФІЗІКІ НЕАБХОДНЫ ВА ЎСІХ СФЕРАХ ЖЫЦЦЯ

## Справаздача дэкана фізічнага факультэта Віктара АНІШЧЫКА аб выкананні праграм перспектыўнага развіцця

Высокая якасць фундаментальнай і спецыяльнай падрыхтоўкі студэнтаў-фізікаў, падмацаваная сучасным узроўнем навуковых даследаванняў па важнейшых напрамках фізічнай навукі, вызначаецца найперш інфраструктурай факультэта, якая ствралася амаль пяць дзесяцігоддзяў, наяўнасцю педагагічных і навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

На факультэце функцыянуе 12 кафедраў: агульнай фізікі; ядзернай фізікі і электронікі; атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі; фізічнай оптыкі; лазернай фізікі і спектраграфіі; энергафізікі; тэарэтычнай фізікі; біяфізікі; фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі; фізікі цвёрдага цела; методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі. Тут створаны ўсе перадумовы для забеспячэння пастаяннага ўдасканальвання працэсу навучання і выхавання студэнтаў, сфарміраваны кваліфікаваны выкладчыцкі склад. Колькасць штатных супрацоўнікаў факультэта – 300 чалавек, з іх 103 – выкладчыкі (прафесары, дацэнты, асістэнты) і 86 – супрацоўнікі НДЧ. На факультэце працуе 24 дактары і 64 кандыдаты навук. Для чытання лекцый, кіравання курсавымі і дыпломнымі працамі прыцягваюцца вядучыя супрацоўнікі НДІ прыкладных фізічных праблем, НДІ ядзерных праблем, інстытутаў НАН Беларусі, НВА "Інтэграл" і інш. Сярэдні ўзрост штатных супрацоўнікаў складае: ПВС – 52 гады, прафесары – 61 год, навуковыя супрацоўнікі – 43 гады.

У магістратуры навучаецца 11 чалавек, у аспірантуры – 54 (з адрывам ад вытворчасці – 47, без адрыву – 7). Паводле даных на 01.09.2007 на фізічным факультэце навучаецца 676 студэнтаў.

Асноўныя напрамкі развіцця і задачы факультэта вызначае Вучоны савет. Сённяшні яго склад, у які ўваходзяць выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта, прадстаўнікі НАН Беларусі, НДІ ПФП, НВА "Інтэграл", НДЧ БДУ, грамадскіх арганізацый, быў абраны ў кастрычніку 2005 г. і зацверджаны загадам рэктара 10 студзеня 2006 г.

Навукова-метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу ажыццяўляе метадычная камісія з 13-ці найбольш аўтарытэтных і дасведчаных выкладчыкаў. Асноўнымі напрамкамі работы камісіі з'яўляюцца: павышэнне эфектыўнасці навучальнага працэсу, пошук новых формаў навучання і кантролю ведаў студэнтаў, распрацоўка нарматыўнай дакументацыі, што рэгламентуе падрыхтоўку спецыялістаў.

У цэлым факультэт працуе адпаведна перспектыўным планам развіцця, планам работы Вучонага савета факультэта і метадычнай камісіі, планам работы кафедраў.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасці 1-31 04 01 "Фізіка" па 4-х кірунках: навукова-даследчы (кваліфікацыя "Фізік. Даследчык"); навукова-педагагічны (кваліфікацыя "Фізік. Выкладчык фізікі і інфарматыкі"); вытворчы (кваліфікацыя "Фізік. Інжынер"), кіраўнічы (кваліфікацыя "Фізік. Менеджэр").

*Слайд 1*




Спецыялізаваная падрыхтоўка ажыццяўляецца на 10-ці кафедрах па наступных спецыялізацыях: тэарэтычная фізіка, фізіка цвёрдага цела; біяфізіка, фізічная оптыка; лазерная фізіка і спектраскапія; фізіка паўправаднікоў і дыэлектрыкаў; энергафізіка; цеплафізіка; ядзерная фізіка і электроніка; атамная фізіка; фізіка ахоўных пакрыццяў; медыцынская біяфізіка; радыяцыйная энергетыка; мікраэлектроніка; фізічная метралогія і аўтаматызацыя эксперыменту; кампутарнае мадэляванне фізічных працэсаў; новыя матэрыялы і тэхналогіі; вакуумныя тэхналогіі; лазерныя тэхналогіі; методыка выкладання фізікі і інфарматыкі; навучальны фізічны эксперымент; прыкладная спектралогія; рацыянальнае матэрыялазнаўства; фізіка неразбуральнага кантролю; фізіка дыяменту і звышцвёрдых матэрыялаў; фізічная інфарматыка. У залежнасці ад запытаў прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі, штогадова задзейнічаны 14–15 спецыялізацый.

Свайго абітурыента факультэт шукае як у Мінску, так і па ўсёй краіне па шырокім спектры кірункаў, сярод якіх можна адзначыць наступныя.

1. Фізічны факультэт штогод удзельнічае ў арганізацыі і правядзенні раённых, гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх школьных алімпіяд па фізіцы і астраноміі, Мінскага гарадскога і Рэспубліканскага турніраў юных фізікаў, гарадскіх аглядаў-конкурсаў на лепшую навуковую работу школьнікаў па фізіцы і экалогіі, навукова-практычных канферэнцый Ліцэя БДУ, рэспубліканскіх навуковых школьных канферэнцый па фізіцы, астраноміі і экалогіі. На базе факультэта кожны год ладзяцца летнія зборы па падрыхтоўцы каманды школьнікаў на Міжнародную фізічную алімпіяду.

2. Праводзіцца штогадовая алімпіяда "Абітурыент БДУ" па фізіцы, пераможцам і ўдзельнікам якой рассылаюцца персанальныя запрашэнні да паступлення на фізічны факультэт.

3. На факультэце працуе дзённа-завочная школа па фізіцы і матэматыцы для абітурыентаў.

4. Выкладчыкі факультэта рэгулярна выступаюць з лекцыямі перад навучэнцамі вядучых фізіка-матэматычных цэнтраў рэспублікі (Ліцэй БДУ, ліцэй № 1, ліцэй № 2, СШ № 50, СШ № 51 г. Мінска, Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй, ліцэй г. Магілёва, СШ № 52 г. Гомеля, ліцэй і гімназія г. Барысава, ліцэй і гімназія № 5 г. Баранавічы, гімназія г. Дзяржынска, шэрагу сярэдніх школ г. Брэста і інш.), а таксама перад настаўнікамі фізікі ў інстытутах павышэння кваліфікацыі.

5. Двойчы на год ладзіцца дзень адчыненых дзвярэй.

6. Штогод рыхтуецца інфармацыя аб факультэце для прэсы (газеты "Універсітэт", "Настаўніцкая газета", "Знамя юности", часопісы "Фізіка: праблемы выкладання", "Репетитор"), прыёмнай камісіі, web-сайта факультэта.

Акрамя таго, для школьнікаў і настаўнікаў рэспублікі на факультэце арганізуюцца гутаркі і экскурсіі. Асобная праца вядзецца з навучэнцамі Ліцэя БДУ. У прафарыентацыйнай рабоце актыўна ўдзельнічаюць студэнты, магістранты і аспіранты факультэта.

Вынікі прыёмных кампаній за апошнія гады сведчаць пра дастаткова высокую падрыхтоўку большасці абітурыентаў фізічнага факультэта. Конкурс захоўваецца на ўзроўні 1,5–2 чалавекі на месца.

Паводле рэгіёнаў рэспублікі студэнты I курса (бюджэтная форма) размеркаваліся наступным чынам: Мінск – 47 (38 %); Мінская вобласць – 19 (15 %); Брэсцкая вобласць – 14 (11 %); Гродзенская вобласць – 8 (7 %); Гомельская вобласць – 7 (6 %); Магілёўская вобласць – 5 (4 %); Віцебская вобласць – 22 (18 %).

Аналіз адказаў студэнтаў I курса на анкетныя пытанні дазваляе сцвярджаць, што пераважная большасць паступае на факультэт з-за высокага ўзроўню выкладання і магчымасці атрымаць патрэбную спецыяльнасць.

Навучальны працэс на фізічным факультэце базуецца на Вучэбных і Рабочых планах спецыяльнасці 1-31 04 01 "Фізіка", зацверджаных рэктарам БДУ 01.01.2001. Яны заснаваныя на паслядоўным, лагічна абгрунтаваным выкладанні вучэбнага матэрыялу, скаардынаваным паводле магчымасцяў яго засваення студэнтамі. На першых курсах ажыццяўляецца фундаментальная падрыхтоўка па матэматыцы, агульнай фізіцы і праграмаванні. Затым выкладаюцца раздзелы тэарэтычнай фізікі і спецыяльныя дысцыпліны. Спецыялізаваная падрыхтоўка пачынаецца з III курса. Навучальны працэс заканчваецца вытворчай практыкай і дзяржаўнай атэстацыяй.

Краевугольным каменем падрыхтоўкі з'яўляецца неадасобленасць навучальнага працэсу ад навуковых даследаванняў, што праводзяцца на факультэце, і ўдзел у іх студэнтаў, які паглыбляецца па меры навучання і пераходу з курса на курс.

На працягу апошніх гадоў абсалютная паспяховасць па факультэце ў цэлым практычна не змянілася і складае 88–89 %.

Формамі арганізацыі навучальнага працэсу на фізічным факультэце з'яўляюцца лекцыі, практычныя заняткі, вытворчая практыка і кантраляваная самастойная работа (КСР), якая падзяляецца на аўдыторную (лабараторныя заняткі; кантрольныя работы; тэставанне, у тым ліку кампутарнае; выступленне з дакладамі; напісанне курсавых, дыпломных прац, магістэрскіх дысертацый) і пазааўдыторную (праца над канкрэтнымі заданнямі; прапрацоўка асобных раздзелаў курса; падрыхтоўка да заняткаў; напісанне рэфератаў, курсавых, дыпломных прац, магістэрскіх дысертацый).

Да прыкладу, у курсе агульнай фізікі (агульны аб'ём аўдыторных заняткаў складае 902 гадзіны) формы правядзення заняткаў размеркаваны наступным чынам: лекцыі – 308 (34 %), практычныя – 222 (25 %), КСР – 372 (41 %).

Укараненне новых адукацыйных тэхналогій ажыццяўляецца бесперапынна з улікам фінансавых і тэхнічных магчымасцяў факультэта. Для павышэння эфектыўнасці самастойнай работы студэнтаў неабходна наяўнасць свабоднага доступу студэнтаў у кампутарныя класы (што патрабуе павелічэння сучаснага кампутарнага парку); наяўнасць аўдыторый, абсталяваных сучаснымі тэхнічнымі сродкамі (відэапраектары, графапраектары і г. д.); істотнае пашырэнне магчымасцяў памнажальнай тэхнікі на факультэце і на кафедрах; забеспячэнне ліцэнзійнымі праграмнымі прадуктамі і якаснага доступу ў інтэрнэт для выкладчыкаў і студэнтаў.

*Табліца 1*
*Доля КСР у Рабочым плане 2007/2008 навучальнага года (кваліфікацыя "Фізік. Даследчык", 5 гадоў)*

| Найменне блока дысцыплін | Колькасць гадзін | КСР | |
|---|---|---|---|
| | | колькасць гадзін | % |
| Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны | 1070 | 80 | 8 |
| Прыродазнаўчыя дысцыпліны | 1198 | 198 | 17 |
| Агульнапрафесійныя і спецыяльныя дысцыпліны | 1820 | 562 | 31 |
| Дысцыпліны спецыялізацыі | 914 | 448 | 49 |
| **Усяго** | **5002** | **1288** | **26** |

Кантроль ведаў студэнтаў на фізічным факультэце мае наступныя формы: цякучы кантроль (кантрольныя работы; калёквіумы; тэсты, у тым ліку кампутарныя; рэфераты; праверка выкання задання і інш.), выніковы кантроль (вусны і пісьмовы іспыт; сумоўе; рэйтынгавая сістэма ацэнкі па дысцыпліне).

Распрацавана факультэцкае Палажэнне аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне. Усе кафедры ў большай ці меншай ступені выкарыстоўваюць гэтую сістэму, а на многіх матэматычных дысцыплінах яна існуе ўжо больш за 20 гадоў.

У адпаведнасці з выкананнем праграмы "Удасканаленне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай працы студэнтаў (2005–2009 гг.)" створана 142 вучэбна-метадычныя комплексы (ВМК), выдадзены 91 вучэбны дапаможнік (акрамя таго, 11 знаходзіцца ў друку), падрыхтаваны электронныя варыянты вучэбных праграм, вучэбных дапаможнікаў, канспектаў лекцый, прэзентацый, тэставых заданняў, кантрольных пытанняў, тэм для напісання рэфератаў, заданняў для правядзення лабараторных заняткаў, калёквіумаў, кантрольных работ і г. д.).

Электронны рэсурс вучэбных матэрыялаў, падрыхтаваных выкладчыкамі факультэта, размешчаны:

- у раздзеле *info* сайта фізічнага факультэта (656 крыніц) з магчымасцю дыстанцыйнага доступу;
- на серверы фізічнага факультэта (978 крыніц) з магчымасцю доступу ва ўніверсітэцкай сетцы;
- на кафедральных кампутарах (1310 крыніц).

Акрамя таго, на серверы фізічнага факультэта дзейнічае бібліятэка электронных варыянтаў вядомых падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і манаграфій па фізіцы і матэматыцы (больш за 17 000 крыніц). Створаны рэсурс электронных вучэбных матэрыялаў у сукупнасці з друкаванымі вучэбнымі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі дазволіў практычна цалкам забяспечыць навучальны працэс неабходнай літаратурай.

На факультэце рэгулярна ладзяцца навукова-метадычныя семінары, на якіх абмяркоўваюцца пытанні стварэння электронных варыянтаў вучэбна-метадычных матэрыялаў, кантролю самастойнай работы студэнтаў, рэйтынгавай ацэнкі ведаў, пытанні сучасных адукацыйных тэхналогій і інш.

Задачу паступовага ўключэння студэнтаў у самастойную навукова-даследчую работу ў межах абранай спецыялізацыі, адаптацыі да ўмоў будучай прафесійнай дзейнасці выконвае вытворчая практыка. Падчас яе студэнты знаёмяцца з апаратурай і базавымі ўстаноўкамі практыкі, арганізацыяй навуковай і вытворчай дзейнасці, удзельнічаюць у вытворчым жыцці прадпрыемстваў, атрымліваюць навыкі работы на сучасным эксперыментальным абсталяванні, збіраюць матэрыял для дыпломнай працы.

Асноўнымі базамі практыкі студэнтаў факультэта з'яўляюцца інстытуты НАН Беларусі, спецыялізаваныя кафедры фізфака, інстытуты і цэнтры БДУ, ВНУ і навукова-даследчыя цэнтры г. Мінска, прадпрыемствы і навукова-вытворчыя цэнтры.

Паказальнікі выніковай атэстацыі студэнтаў фізічнага факультэта прыведзены ў табліцы 2.

Штогод ДЭК рэкамендуе да апублікавання (ці ўкаранення на вытворчасці, у навучальным працэсе і г. д.) вынікі больш за 30 % дыпломных прац.

Пры размеркаванні выпускнікоў факультэта заяўкі паступа-

УНІВЕРСІТЭТ

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

юць з навукова-даследчых інстытутаў НАН Беларусі, БДУ, устаноў адукацыі і навукова-даследчых цэнтраў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, з прадпрыемстваў электроннай, радыёэлектроннай, аптычнай, аўтамабільнай, трактарнай, прыладабудавальнай і іншых галін прамысловасці, а таксама з кафедраў фізфака. Акрамя таго, значная частка выпускнікоў размяркоўваецца ў канкрэтныя арганізацыі адпаведна атрыманай кваліфікацыі і профілю спецыялізацыі па індывідуальных заяўках.

У апошнія тры гады колькасць заявак істотна перавышала колькасць выпускнікоў (адпаведна 84 і 58 у 2005 г.; 145 і 136 у 2006 г.; 137 і 118 у 2007 г.). Сёлета былі размеркаваныя ўсе студэнты V курса, за выключэннем двух, якія атрымалі права на самастойнае працаўладкаванне паводле наяўных ільгот.

Вучоны савет фізічнага факультэта штогод дае рэкамендацыі для паступлення ў магістратуру і аспірантуру БДУ і НАН Беларусі больш чым 40 выпускнікам.

Ідэалагічная і выхаваўчая работа на факультэце плануецца і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Канцэпцыяй выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь (Пастанова калегіі Міністэрства адукацыі ад 30.11.1999 № 24), Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2006–2010 гг. (Пастанова калегіі Міністэрства адукацыі ад 28.12.2006 № 132), Планам ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на цякучы навучальны год, Планам удасканальвання ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (загад рэктара БДУ ад 23.02.2007 № 159-ПС) і іншымі нарматыўнамі дакументамі і палажэннямі.

Слайд 2




Вучэбна-выхаваўчая работа, якая праводзіцца на факультэце, мае за мэту фарміраванне ў студэнтаў творчага і адказнага стаўлення да вучобы і працы, сацыяльнай актыўнасці і грамадзянскай самасвядомасці. З ліку студэнцкіх арганізацый функцыянуюць наступныя: Савет старастаў факультэта, Студэнцкі савет па якасці адукацыі, прафсаюзная арганізацыя студэнтаў, Студэнцкі савет інтэрната № 2, БРСМ, Студэнцкі саюз, аргкамітэты "Дзён фізіка", рэдкалегіі газеты "Пазітрон" і "СпортАгляд". У склад студэнцкага актыву факультэта ўваходзяць 79 чалавек. Найбольшае прадстаўніцтва на факультэце маюць такія моладзевыя арганізацыі, як прафсаюзная арганізацыя студэнтаў (512 членаў), а таксама ГА "БРСМ" (197 членаў у 2007/ 2008 навуч. г. – 29 % ад агульнай колькасці студэнтаў).

Шэраг мерапрыемстваў быў праведзены на фізічным факультэце ў 2006/2007 навуч. г. упершыню, напрыклад, Дні беларускай гісторыі, праграма якіх рыхтавалася гістарычным факультэтам БДУ. У іх рамках ладзіліся цікавыя сустрэчы і лекцыі. Асаблівую ўвагу ў студэнтаў выклікала віктарына "Ці ведаеце Вы гісторыю універсітэта і факультэта?", а таксама прэзентацыя рыцарскага клуба студэнтамі факультэта-арганізатара. Безумоўна, вялікае значэнне ў межах грамадзянска-патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі мелі сустрэчы з ветэранамі баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў. Сярод мерапрыемстваў, падрыхтаваных у 2006/2007 навуч. г. выключна па ініцыятыве студэнтаў, трэба адзначыць такія, як творчы конкурс студэнцкіх фотаработ "Фізфак фатаграфуе!", а таксама акцыю "Цыгарэты на цукеркі", накіраваную на прапаганду здаровага ладу жыцця і адмову ад курэння.

Навукова-даследчая работа праводзіцца на ўсіх кафедрах факультэта. Функцыянуюць 11 навукова-даследчых лабараторый, Беларускі міжуніверсітэцкі цэнтр структурных даследаванняў і 4 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. У выкананні НДР удзельнічаюць 86 штатных супрацоўнікаў НДЧ (72 навуковыя супрацоўнікі, 14 інжынераў і лабарантаў, у тым ліку 3 дактары навук і 36 кандыдатаў навук), 98 чалавек з прафесарска-выкладчыцкага складу (у тым ліку 24 дактары навук і 63 кандыдаты навук), а таксама 2 дактаранты, 42 аспіранты, 11 магістрантаў, 165 студэнтаў і больш за 100 сумяшчальнікаў з акадэмічных арганізацый, ВНУ і прамысловых прадпрыемстваў. Выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі факультэта рэгулярна павышаюць сваю кваліфікацыю ў РІВШ і інстытутах НАН Беларусі і ўдзельнічаюць у міжнародных замежных канферэнцыях.

Фізічны факультэт з'яўляецца галоўным выканаўцам і сакаардынатарам па чатырох дзяржаўных комплексных праграмах навуковых даследаванняў: "Крышталічныя і малекулярныя структуры", "Фатоніка", "Біялагічная інжынерыя і біябяспека", "Нанаматэрыялы і нанатэхналогіі".

Дынаміка фінансавання навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ на факультэце прадстаўлена на слайдзе 2, адкуль відаць, што агульны аб'ём выдаткаў на НДР у 2007 г. склаў больш за 2,6 млрд бел. руб.

За справаздачны перыяд на факультэце выканана 116 планавых навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ па дзяржбюджэце і 9 тэм па гаспадарчых дагаворах (у тым ліку 54 НДР паводле заданняў 9-ці дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, дзяржаўных праграм арыентаваных фундаментальных даследаванняў, дзяржаўных комплексных праграм навуковых даследаванняў, 9 НДР паводле 5-ці дзяржаўных і дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм (ДНТП), 43 заданні – па грантах Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. За апошнія 3 гады назіраецца значнае павелічэнне аб'ёму работ паводле гаспадарчых дагавораў і ДНТП – заданняў, звязаных з рэальным сектарам эканомікі.

З 2004/2005 па 2006/2007 навуч. гг. штатнымі навуковымі супрацоўнікамі і выкладчыкамі факультэта апублікавана 1594 навуковыя працы, у тым ліку 6 манаграфій, 4 зборнікі навуковых прац, 96 вучэбных дапаможнікаў, 1015 артыкулаў і 473 тэзісы дакладаў, што складае больш за 2,5 публікацыі на чалавека ў год.

Супрацоўнікі факультэта вельмі актыўна ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях. Штогод ахопліваецца болей за 70 міжнародных канферэнцый, на якіх прадстаўляюцца больш як 200 дакладаў. Акрамя таго, 2–3 канферэнцыі кожны год ладзяцца на базе факультэта. Так, напрыклад, у 2005 і 2007 гг. былі праведзеныя VI і VII Міжнародныя канферэнцыі "Узаемадзеянне выпраменьванняў з цвёрдым целам", у 2006 г. – XIII Міжнародная канферэнцыя "Асновы і дасягненні сучаснай тэорыі самаарганізацыі".

За справаздачны перыяд на факультэце абаронена 2 доктарскія і 17 кандыдацкіх дысертацый. Асноўная колькасць аспірантаў абараняецца на працягу 1–2 гадоў пасля заканчэння аспірантуры. Так, напрыклад, у цякучым годзе пры выпуску 12-ці чалавек адзін аспірант абараніўся ў тэрмін (падчас навучання ў аспірантуры), яшчэ 2 аспіранты абараніліся і 3 аспіранты падалі дысертацыі ў саветы па абароне дысертацый у год заканчэння аспірантуры. Такім чынам, на працягу года палова аспірантаў абароніцца.

На факультэце навучаецца 5 замежных аспірантаў. Адначасова аспіранты факультэта выязджаюць у замежныя камандзіроўкі з мэтай выкарыстання унікальнага абсталявання і ўдзелу ў міжнародных канферэнцыях. У якасці прыкладу эфектыўнай сумеснай работы аспірантуры БДУ і замежных універсітэтаў можна прывесці абарону дысертацый у тэрмін аспірантам С. Сасноўскім у рамках міжнароднага супрацоўніцтва БДУ з Анкалагічным цэнтрам Алексіс Ватрэн (г. Нансі, Францыя).

Вялікая ўвага на факультэце надаецца навукова-даследчай рабоце студэнтаў, якая праводзіцца па наступных кірунках: выкананне курсавых і дыпломных прац, удзел студэнтаў у выкананні дзяржаўнабюджэтных НДР, работа ў СНДЛ, навуковых гуртках, НДІ і на прамысловых прадпрыемствах. Да кіраўніцтва НДРС прыцягнута 75 % выкладчыкаў і 45 % навуковых супрацоўнікаў фізічнага факультэта. Студэнты ўдзельнічаюць у выкананні навукова-даследчых работ шэрагу інстытутаў. Супрацоўнікі НДЧ факультэта і навукова-даследчых інстытутаў БДУ і НАН Беларусі актыўна ўключаюцца ў кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі працамі, пачынаючы з трэцяга года навучання. Каардынацыя навуковай работы студэнтаў ажыццяўляецца Саветам па НДРС факультэта.

*Табліца 2*

| Год | Дзяржаўныя экзамены | | | Дыпломная праца | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | "выдатна" | "добра" | "здавальн." | "выдатна" | "добра" | "здавальн." |
| 2004/05 | 59 % | 36 % | 5 % | 75 % | 24 % | 1 % |
| 2005/06 | 41% | 54% | 5 % | 81 % | 18 % | 1 % |
| 2006/07 | 43% | 52% | 5 % | 74 % | 24 % | 2 % |

Студэнты ўдзельнічаюць у рабоце навуковага гуртка на кафедры тэарэтычнай фізікі, а таксама ў рабоце 4-х студэнцкіх СНДЛ: "Нелінейная дынаміка фізічных сістэм", "Біяфізіка і клеткавыя тэхналогіі", "Фізіка структураваных паўправаднікоў", "Мадыфікацыя ўласцівасцяў матэрыялаў з дапамогай кампрэсійных і іонаплазменных патокаў".

Актыўнасць навукова-даследчай работы студэнтаў пацвярджаецца колькасцю публікацый і ўдзелам студэнтаў у навуковых канферэнцыях. За апошнія тры гады студэнтамі апублікавана 398 навуковых прац, зроблена 462 даклады на навуковых канферэнцыях, атрымана 19 даследчых грантаў БДУ для студэнтаў і аспірантаў. Штогод ладзіцца навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ і традыцыйны факультэцкі агляд-конкурс на найлепшую студэнцкую навуковую працу, пераможцы якога ўзнагароджваюцца грашовымі прэміямі, а найлепшыя работы публікуюцца ў зборніку прац навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў БДУ. Паводле вынікаў конкурсу навуковых прац студэнтаў ВНУ краіны па гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках за тры гады 16 прац адзначаны дыпломамі I катэгорыі, 2 студэнты сталі лаўрэатамі рэспубліканскага конкурсу.

Факультэт супрацоўнічае з айчыннымі і замежнымі навукова-даследчымі арганізацыямі, навучальнымі ўстановамі і прамысловымі прадпрыемствамі. Паспяхова функцыянуе сумесны вучэбна-навуковы цэнтр і філіялы кафедраў у шэрагу інстытутаў НАН Беларусі: Інстытуце фізікі, Аб'яднаным інстытуце фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, АНК "Інстытут цепламасаабмену", Інстытуце электронікі, Інстытуце біяфізікі і клеткавай інжынерыі.

Плённа развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва. Факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з ВНУ і навуковымі арганізацыямі Расіі, Германіі, Польшчы, Чэхіі, Францыі, Іспаніі, Манголіі, Швейцарыі, Швецыі, Іарданіі, Сірыі. Навукова-тэхнічная работа праводзіцца па 27-мі дамовах аб супрацоўніцтве з замежнымі універсітэтамі, выконваюцца міжнародныя праекты па праграмах "ИНТАС", НК НАТА, VISBU, АІЯД (г. Дубна, Расія), расійска-беларускай праграме "Космас" і грантам Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.

Фізічны факультэт БДУ рос і развіваўся паралельна з навукаёмістымі вытворчасцямі і фундаментальнай фізічнай навукай, для якіх ён рыхтаваў кадры і ствараў навуковае забеспячэнне.

Высокі ўзровень нашых выпускнікоў засноўваецца на грунтоўнай базавай падрыхтоўцы па фізіцы, матэматыцы і спецыяльных дысцыплінах асноўных кірункаў фізічнай навукі. Спецыялісты-фізікі неабходны практычна ва ўсіх сферах нашага жыцця: у адукацыі, машынабудаванні, электроннай прамысловасці, энергетыцы і г. д.

З улікам перспектыўнага развіцця грамадства, побач з падрыхтоўкай спецыялістаў у галіне традыцыйных кірункаў фізікі неабходна планаваць падрыхтоўку фізікаў у галінах, найбольш запатрабаваных навукай, тэхнікай і эканомікай Беларусі: энергетыка (асабліва яе нетрадыцыйныя віды – атамная, сонечная і г. д.), энергазберагальныя тэхналогіі, новыя матэрыялы (біяпалімеры, кампаўндматэрыялы, металакерамін і г. д.), новыя фізічныя прынцыпы апрацоўкі і ўмацавання матэрыялаў, у тым ліку лазерных, нелінейная оптыка і оптаэлектроніка, новыя прынцыпы апрацоўкі інфармацыі і інш.

## СЛОВА РЭКТАРУ

***У сваім выступленні рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў адзначыў шэраг важных момантаў, якія асвятляюцца ў ніжэйпададзеным каментары.***

Безумоўна, фізічны факультэт валодае вялікім навуковым патэнцыялам і характарызуецца высокім узроўнем выкладання. Вядзецца работа па падрыхтоўцы навуковых кадраў. Але калі параўнаць з сітуацыяй 20-гадовай даўнасці, то сёння назіраецца істотны колькасны разрыў паміж выкладчыкамі, якія дасягнулі вяршыняў у навуцы, і тымі, хто толькі распачынае свой шлях. Гэта вельмі непакоіць, таму што пад пагрозу трапляе пераемнасць пакаленняў і будучыня самой фізічнай навукі. У сучасных рэаліях факультэту трэба рашаць задачу не толькі захавання, але і развіцця кадравага патэнцыялу. Да таго ж на парадку дня стаіць пытанне аб падрыхтоўцы спецыялістаў для рэгіянальных універсітэтаў, якія ў апошнія гады часткова самаізаляваліся і фарміруюць свой выкладчыцкі склад у асноўным з уласных выпускнікоў. А наступствы такой сітуацыі лёгка прадбачыць.

Пра перспектывы фізічнай навукі варта задумвацца ўжо сёння (дакладней, учора), паколькі яна шмат у чым уплывае на стан айчыннай прамысловасці і развіцця краіны. Канешне, эксперыментальная фізіка моцна залежыць ад фінансавання яе матэрыяльнай базы. Але рэспубліка не можа выдаткоўваць такія сродкі, як у часы СССР, таму трэба вызначацца ў выбары перспектыўных кірункаў навуковых даследаванняў. Зразумела, гэта праблема не толькі факультэта, але і універсітэта. Аднак для яе вырашэння кожны на сваім месцы мусіць прыкласці ўсе намаганні, і кіраўніцтва факультэта тут павінна заняць больш актыўную пазіцыю.

Далей, у БДУ дзейнічае праграма развіцця самастойнай работы студэнтаў з дапамогай сістэмы e-University. Высветлілася, што на фізічным факультэце гэтыя рэсурсы выкарыстоўваюцца мала, а таксама адзначана недастатковае распаўсюджанне электронных кантрольных тэстаў для праверкі не толькі самастойнай, але і ўсёй вучэбнай работы студэнтаў. Відавочна, такое становішча не адпавядае статусу факультэта. Для сучасных фізікаў кампутар – аснова прафесійнай дзейнасці. Асабліва важна выпрацаваць гэтыя навыкі ў студэнтаў I–III курсаў. Сістэма тэставання для малодшых курсаў можа быць створана з дапамогай старшакурснікаў, магістрантаў, аспірантаў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў. І гэта трэба зрабіць на працягу года, каб павысіць узровень і якасць ведаў маладых спецыялістаў.

АФІЦЫЙНА

# АБ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ РАЗВІЦЦЯ ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Ў 2004–2006 ГГ.

## З даклада прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара Віктара Самахвала

У адпаведнасці з загадам рэктара БДУ камісія ў складзе прарэктара па вучэбнай рабоце В. Самахвала (старшыня), начальніка ГУ ВНМР Л. Хухлындзінай (намеснік старшыні), начальніка УПКВК К. Каросціка (намеснік старшыні), начальніка аддзела ГУ ВНМР Г. Дубасарскага, загадчыка кафедры фізікі факультэта радыёфізікі і электронікі У. Саечнікава, намесніка дырэктара НДІ ЯП БДУ А. Лабко, загадчыка кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі ФРіЭ М. Кугейкі, намесніка дэкана юрыдычнага факультэта А. Шыдлоўскага, начальніка УВРМ П. Скалабана была праведзена праверка вучэбнай, навукова-даследчай, ідэалагічнай і выхаваўчай работы на фізічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Дыяграма 1




Камісія адзначыла, што на факультэце праводзіцца работа па выкананні праграм перспектыўнага развіцця БДУ, удасканальванні вучэбнай, навуковай, ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

У рамках спецыяльнасці 1-31 04 01 "Фізіка" факультэт ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў па чатырох кірунках (навукова-даследчая дзейнасць, вытворчая дзейнасць, навукова-педагагічная дзейнасць, кіраўнічая дзейнасць) і 16-ці спецыялізацыях.

Факультэт налічвае 12 кафедраў, на якіх працуюць 154 выкладчыкі, з якіх 103 – на пастаяннай аснове. З іх ліку 84 % маюць вучоную ступень ці званне. Колькасць выкладчыкаў з вучонай ступенню (званнем) на ўсіх кафедрах, акрамя кафедры методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, вышэйшая за ўстаноўленыя нормы.

У 1998 г. з прычыны нізкага конкурсу на факультэце сярод абітурыентаў і праблем з размеркаваннем быў паменшаны прыём на I курс. Усё гэта абвастрыла кадравую сітуацыю, звязаную са скарачэннем колькасці выкладчыкаў. Кіраўніцтва факультэта прыняло адпаведныя меры, якія дазволілі працаўладкаваць маладых выкладчыкаў і забяспечыць дастатковы конкурс у 2007 г.

Узроставы паказальнік штатных выкладчыкаў факультэта прыведзены на дыяграме 1, адкуль відаць, што істотная частка мае ўзрост да 50-ці гадоў (37 %).

Узровень педагагічнага майстэрства выкладчыкаў ацэньваўся шляхам правядзення штогадовага анкетавання студэнтаў II і IV курсаў. На пытанне "Ці задаволены Вы прафесійным узроўнем і кампетэнцыяй выкладчыцкага складу?" колькасць станоўчых адказаў з кожным годам расце. Гэтая дынаміка паказана на дыяграме 2.

Дыяграма 2




У навучальным працэсе актыўна выкарыстоўваюцца камп'ютарныя тэхналогіі. Факультэт праводзіць вялікую работу па бесперапынным навучанні інфармацыйным тэхналогіям на працягу ўсяго перыяду навучання і не абмяжоўваецца базавымі асновамі. Прыкладам гэтаму служыць большая частка курсавых і дыпломных прац, напісаных пры дапамозе праграмнага дадатку Microsoft Office.

У выкладанні некаторых дысцыплін прафесійнай падрыхтоўкі выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў. Аналіз паспяховасці сведчыць, што на факультэце па выніках экзаменацыйных сесій за апошнія тры навучальныя гады працэнт паспяховасці студэнтаў мае тэндэнцыю да павелічэння. 10–16 % студэнтаў з'яўляюцца выдатнікамі вучобы (гл. табл.)

Падчас праверкі на II і III курсах былі праведзены комплексныя кантрольныя работы. Студэнты прадэманстравалі ўзровень ведаў, адпаведны патрабаванням, якія прад'яўляюцца для акрэдытацыі спецыяльнасці. Працэнт станоўчых адзнак па фізіцы на II курсе склаў 94 %, на III – 90 %; па вышэйшай матэматыцы на II курсе – 91 %. Некаторыя студэнты прапанавалі нават некалькі варыянтаў рашэння адной задачы ці рашэнні з выкарыстаннем нестандартных алгарытмаў, што сведчыць пра глыбокае валоданне матэрыялам і разуменне матэматычнага апарату. Аднак хвалюе той факт, што каля 10 % студэнтаў не адолелі заданні.

*Табліца 1. Паспяховасць студэнтаў за 2004/2007 навуч. гг.*

| Год | | Абсалютная паспяховасць (%) | Здалі сесію на "выдатна" (%) | Маюць у сесіі нездавальняльныя адзнакі (%) |
|---|---|---|---|---|
| 2005 | зім. | 82 | 15 | 16 |
| | лет. | 88 | 16 | 9 |
| 2006 | зім. | 85 | 12 | 8 |
| | лет. | 89 | 15 | 8 |
| 2007 | зім. | 89 | 10 | 9 |
| | лет. | 88 | 15 | 10 |

Агульным недахопам работ з'яўляецца наяўнасць вылічальных памылак на ўсіх стадыях рашэння і недакладнае афармленне рашэння задач.

Для вучэбна-метадычнага забеспячэння самастойнай работы на факультэце прыкладзена шмат намаганняў для стварэння інфармацыйных рэсурсаў з арганізацыяй дыстанцыйнага доступу. Аднак кіраўніцтву факультэта трэба звярнуць увагу на тое, што пры анкетаванні на пытанне "Як Вы лічыце, ці ўласцівы навучальнаму працэсу на Вашым факультэце гнуткасць, мабільнасць у выбары метадаў выкладання і саміх выкладчыкаў, у абнаўленні змесце дысцыплін, вучэбных

Дыяграма 3




планаў і адукацыйных тэхналогій?" у студэнтаў II курса з кожным годам растуць станоўчыя адказы, а ў студэнтаў IV курса дынаміка адмоўная. Вынікі паказаны на дыяграме 3.

За апошнія тры гады штатнымі навуковымі супрацоўнікамі і выкладчыкамі факультэта апублікавана 1594 навуковыя працы, у тым ліку 6 манаграфій, 4 зборнікі навуковых прац, 96 вучэбных дапаможнікаў, 1015 артыкулаў і 473 тэзісы дакладаў, што складае больш за 2,5 публікацыі на чалавека ў год.

Навукова-даследчая работа студэнтаў праводзіцца па наступных асноўных кірунках: выкананне курсавых і дыпломных прац, удзел студэнтаў у выкананні дзяржбюджэтных НДР, работа ў СНДЛ, навуковых гуртках, НДІ і на прамысловых прадпрыемствах. Да кіраўніцтва НДРС прыцягнута 75 % выкладчыкаў і 45 % навуковых работнікаў фізічнага факультэта. Студэнты ўдзельнічаюць у выкананні навукова-даследчых работ шэрагу інстытутаў (НДІ ПФП, НДІ ЯП, НЦ ФЧВЭ, ННДЦ МА пры БДУ, Інстытут фізікі НАНБ, НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі). Супрацоўнікі НДЧ факультэта і навукова-даследчых інстытутаў БДУ і НАН Беларусі актыўна ўключаюцца ў кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі працамі, пачынаючы з III курса.

У апошнія гады назіраецца станоўчая тэндэнцыя па набыцці сучаснага абсталявання для навуковых даследаванняў. У 2005–2007 гг. яго закуплена на суму больш за 1 млрд бел. руб. Унікальнае навуковае абсталяванне размешчана ў Цэнтры калектыўнага карыстання і прызначана для факультэта, структурных падраздзяленняў БДУ і іншых арганізацый рэспублікі.

Адначасова факультэту трэба звярнуць увагу на наступныя моманты:

- падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па педагагічных спецыяльнасцях праз аспірантуру;
- далейшае нарошчванне аб'ёмаў гаспадарча-дагаварных работ, якія сёння складаюць каля 10 % ад агульнай колькасці НДР;
- павышэнне абароны дысертацый аспірантамі ў тэрмін;
- абнаўленне і мадэрнізацыя стандартнага вымяральнага абсталявання для навуковых даследаванняў, паколькі тэрмін службы больш як 90 % прыбораў перавышае 10 гадоў.

У склад студэнцкага актыву факультэта ўваходзіць 79 чалавек, г. зн. 12 % ад агульнай колькасці студэнтаў факультэта. Найбольш прадстаўлены такія моладзевыя арганізацыі, як прафсаюзная арганізацыя студэнтаў (512 членаў у 2007/2008 навуч. г. – 77 % ад агульнай колькасці студэнтаў), а таксама ГА "БРСМ" (197 членаў у 2007/2008 навуч. г. – 29 % ад агульнай колькасці студэнтаў).

У параўнанні з 2006/2007 навуч. г. у шэрагах БРСМ быў 131 студэнт факультэта, у 2005/2006 навуч. г. – 74 студэнты.

Варта адзначыць актыўную дзейнасць у 2006/2007 навуч. г. Студэнцкага савета па якасці адукацыі: анкетаванне і распрацоўка шэрагу новых анкет, арганізацыя студэнцкага форуму на факультэцкім сайце, вылучэнне прапаноў па аптымізацыі сістэмы кантролю наведвання, удзел у падрыхтоўцы і рассылцы лістоў бацькам студэнтаў, выхад з ініцыятывай аб правядзенні адкрытай студэнцкай алімпіяды па фізіцы, арганізацыя акцыі "Цыгарэты на цукеркі", абмеркаванне пытання аб стварэнні паркоўкі для веласіпедаў ля будынку факультэта і інш.

Намаганнямі студэнтаў на факультэце выпускаюцца 4 насценныя газеты. З іх адна ("Пазітрон") асвятляе шырокае кола такіх пытанняў, як грамадска значныя падзеі ў жыцці краіны і г. Мінска, інфармацыя аб мінулых і запланаваных у БДУ і на факультэце мерапрыемствах, пра дзейнасць факультэцкіх студэнцкіх арганізацый, розныя аспекты студэнцкага жыцця, навуковыя навіны, гумарэскі і г. д. Тры астатнія газеты маюць спецыялізаваны характар: "Физфаковский спортивный вестник", астранамічны бюлетэнь "SpikA" і фізічны бюлетэнь "Прамень". Цікавым з'яўляецца ўвасабленне ўжо ў цякучым годзе ідэі стварэння фотагалерэі на сценах уздоўж лесвіцы корпуса фізічнага факультэта як экспрэс-адлюстравання мінулых студэнцкіх мерапрыемстваў.

На факультэцкім сайце *http://www.physics.bsu.by*, акрамя інфармацыі пра выхаваўчы бок навучальнага працэсу (рубрыкі "Інфармацыя пра факультэт", "Студэнцкае жыццё", "Выпускніку") і анатавання канкрэтных мерапрыемстваў, вядзецца таксама праца па стварэнні раздзелаў, прысвечаных дзейнасці факультэцкіх студэнцкіх арганізацый і аб'яднанняў. Пад эгідай Студэнцкага савета па якасці адукацыі на сайце функцыянуе студэнцкі форум, дзе ўздымаюцца самыя розныя пытанні вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці на факультэце. Таксама вядзецца старонка студэнцкага аргкамітэта "Дзён фізіка". На сайце распрацоўваюцца ўласныя старонкі аргкамітэта БРСМ і Студэнцкага савета па якасці адукацыі факультэта.

Падводзячы вынікі праверкі, камісія сведчыць, што вучэбная, навукова-даследчая, ідэалагічная і выхаваўчая работа фізічнага факультэта знаходзіцца на належным узроўні. У далейшым развіцці гэтага падраздзялення прыярытэтнымі напрамкамі павінны стаць:

- удасканальванне арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, падрыхтоўка і выданне дапаможнікаў з разліку адна кніга на аднаго студэнта;
- паглыбленне практычнай накіраванасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў;
- узмацненне ролі IT-тэхналогій у падрыхтоўцы спецыялістаў;
- павышэнне эфектыўнасці працы дактарантуры і аспірантуры;
- павелічэнне ролі прыкладных гаспадарча-дагаварных работ у агульным аб'ёме навукова-тэхнічных распрацовак;
- узмацненне ідэалагічнай і выхаваўчай работы з наданнем асаблівай увагі фарміраванню кампетэнцый грамадзянскасці і патрыятызму, патрэбы ў рашэнні сацыяльных праектаў і забеспячэнні канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі.

НАШЫ ГОСЦІ

# ДЗЕНЬ МАГІЛЁЎСКАГА УНІВЕРСІТЭТА Ў БДУ

***27 лістапада ў БДУ прайшло пад знакам Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта, з якім нас звязвае шматгадовае супрацоўніцтва.***

Гэтым днём у Белдзяржуніверсітэт прыехала на чале з рэктарам больш за 100 гасцей з МДУ імя А. Куляшова, каб падчас сумесных мерапрыемстваў пазнаёміць са сваім універсітэтам. Не менш удзельнікаў далучылася і з нашага боку, якія ў холе Ліцэя БДУ змаглі пабачыць відэапрэзентацыю магілёўскай ВНУ, а таксама наведаць выставу кнігадрукаванай прадукцыі нашых партнёраў. Тут жа, у актавай зале адбылася творчая сустрэча кіраўніцтва, выкладчыкаў і студэнтаў дзвюх навучальных устаноў. Дарагіх гасцей і ўсіх прысутных з радасцю вітаў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, які зрабіў экскурс у гісторыю нашай альма-матэр і распавёў пра яе сённяшні стан. Яго калега Канстанцін Бандарэнка, у сваю чаргу, акрэсліў, што ўяўляе сабой Магілёўскі універсітэт. Затым прарэктары Уладзімір Суворaў і Міхаіл Вішнеўскі змястоўна расказалі пра структуру і арганізацыю выхаваўчай работы з моладдзю ў адпаведных ВНУ.

За афіцыйнай часткай пачалася канцэртная праграма, падрыхтаваная нашымі магілёўскімі сябрамі. Яны зладзілі сапраўднае відовішча, прадэманстраваўшы свае шматгранныя таленты! Пасля цудоўных сольных выступленняў на патрыятычную і нацыянальную тэматыку (да слоў, у выкананні лаўрэатаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў) на сцэне разгарнулася сапраўдная феерыя з этнічных грэцкіх, ірландскіх і славянскіх, а таксама спартыўных лацінаамерыканскіх танцаў.



Выступленне творчага калектыву Магілёўскага універсітэта

Усіх прыемна здзівіла не толькі высокае выканальніцкае майстэрства, але і цудоўны мастацкі густ, выяўлены ў разнастайнасці ўдала падабраных касцюмаў. Да таго ж, гучалі песні а капэла і пад акампанемент народных інструментаў. Публіка была ў захапленні і ўдзячна адорвала выступоўцаў бурнымі авацыямі.



Рэктар МДУ імя А. Куляшова Канстанцін Бандарэнка ўручае сувенір кіраўніку БДУ прафесару Васілю Стражаву

У другой палове дня ў Спартыўным комплексе БДУ паміж нашымі і магілёўскімі студэнтамі прайшлі спаборніцтвы па баскетболе і вольнай барацьбе, а спецыялісты і ўсе зацікаўленыя ўдзельнічалі ў рабоце трох круглых сталоў: "Навукова-метадычнае забеспячэнне ўдасканалення адукацыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь", "Студэнцкае самакіраванне і грамадскія маладзёжныя аб'яднанні ў сучаснай ВНУ" і "Арганізацыя інфармацыйнай і ідэалагічнай работы ў ВНУ". Тут ужо настала чарга здзіўляцца гасцям, якія былі ўражаныя маштабам дзейнасці, матэрыяльнай базай і тэхнічным аснашчэннем Белдзяржуніверсітэта. Разам з тым, магіляўчане падзяліліся ўласнымі напрацоўкамі ў арганізацыі адукацыйнага працэсу, карыснымі і для нашых кіраўнікоў.

Падобная масавая сустрэча ў БДУ праводзілася ўпершыню, дзякуючы ініцыятыве міністра адукацыі Беларусі Аляксандра Радзькова. У далейшым плануецца ладзіць такія мерапрыемствы і з іншымі рэгіянальнымі класічнымі універсітэтамі рэспублікі для ўмацавання сувязяў з вядучай ВНУ краіны і развіцця кааперацыі па розных кірунках.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

АКТУАЛЬНА

# ПАВЫШАЕМ ЯКАСЦЬ ПРАЦЫ

***У Беларускім дзяржаўным універсітэце згодна з рашэннем Вучонага савета ад 24 верасня гэтага года са студзеня 2008 г. мяркуецца ўвесці сістэму рэйтынгавай ацэнкі развіцця асноўных кірункаў дзейнасці: вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і навукова-метадычнай.***

Як паведаміў начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы (УПРАР) Генадзь Дылян, штогод будзе праводзіцца рэйтынгавая ацэнка дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага складу, факультэтаў і інстытутаў, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку спецыялістаў, выпускаючых кафедраў. Для гэтага распрацаваны адпаведныя палажэнні, вызначаны крытэрыі і паказальнікі ацэнкі дзейнасці, механізм падвядзення вынікаў. Факультэты (інстытуты) будуць азнаёмлены з рабочымі матэрыяламі рэйтынгавай сістэмы. Асноўная мэта яе ўкаранення, па словах Генадзя Дыляна, – актывізацыя і павышэнне эфектыўнасці функцыянавання і развіцця асноўных структурных падраздзяленняў, а таксама прафесійнай дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага складу універсітэта.

**Паводле інфармацыі УПРАР**

ДЗЕЛАВЫЯ КАНТАКТЫ

# НАВУКА І ВЫТВОРЧАСЦЬ

***У БДУ 27 лістапада ўпершыню прайшоў семінар-біржа "Новыя рэчывы і тэхналогіі для сельскай гаспадаркі".***

Больш за 22 распрацоўкі прадставілі навуковыя ўстановы рэспублікі, у тым ліку Белдзяржуніверсітэт, НВРУП "Актыў БДУ", Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека БДУ, БДТУ, Інстытут генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі, Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання, Беларуска-казахстанскі цэнтр навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. У мерапрыемстве таксама бралі ўдзел болей за 90 кіраўнікоў і спецыялістаў розных прадпрыемстваў і арганізацый сельскагаспадарчай галіны рэспублікі. Такім чынам, тут сустрэліся патэнцыйныя заказчыкі і непасрэдныя аўтары новых тэхналогій і рэчываў, якія прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы, што дало магчымасць падрабязна пазнаёміцца з распрацоўкамі, абмеркаваць шляхі іх укаранення ў аграрны вытворчы працэс, наладзіць дзелавыя кантакты і нават заключыць папярэднія дамоўленасці аб пастаўках.

Уласна навукоўцы БДУ прапанавалі 10 ноу-хаў. Найбольшай папулярнасцю сярод іх карысталася новае абсталяванне і тэхналогія мікрахвалевай перадпасяўной апрацоўкі насення сельскагаспадарчых і лясных культур, якую вынайшлі ў лабараторыі моцнакропкавай электронікі Інстытута ядзерных праблем БДУ. У прадстаўнікоў ільнозаводаў выклікаў вялікую цікавасць новы спосаб прыгатавання льняной трасты, які прадэманстраваў загадчык кафедры малекулярнай біялогіі біялагічнага факультэта БДУ, доктар біялагічных навук Анатоль Еўтушэнка.

Увагу ўдзельнікаў мерапрыемства прыцягнулі біяпрэпараты для комплекснай абароны раслін "Бактафіл", "Бактаген" і "Аўрын", прадстаўленыя супрацоўнікамі НДЛ малекулярнай генетыкі бактэрый біялагічнага факультэта, а таксама новыя ветэрынарныя прэпараты для лячэння і прафілактыкі мікраэлементозаў у жывёл.

У выніку плённых перамоў практычна па ўсіх прадстаўленых на семінары-біржы распрацоўках былі дасягнуты дамоўленасці аб прадаўжэнні кантактаў і далейшым супрацоўніцтве. Усе ўдзельнікі пагадзіліся, што мерапрыемствы такога кшталту па іншых тэматычных напрамках варта праводзіць і надалей.

Сёлетні семінар-біржа быў арганізаваны Белдзяржуніверсітэтам пры падтрымцы Міжуніверсітэцкага цэнтра маркетынгу НДР, Тэхнапарка БНТУ "Метаніт", Міністэрства адукацыі і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання нашай краіны.

**Ганна ЛАГУН**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Стварэнне пярвічнай арганізацыі "Белая Русь"** – "БелТА (15.12), БелаПАН (17.12), naviny.by (17.12), tut.by (17.12).

**Прэзентацыя Цэнтра перспектыўнага дзяцінства ў БДУ** – БелТА (14.12), БелаПАН (14.12), naviny.by (14.12).

**Каманда БДУ – прызёр першай міжнароднай алімпіяды па астраноміі і астрафізіцы** – "Настаўніцкая газета" (13.12), "Вечерний Минск" (11.12), "Минский курьер" (14.12), "Звязда" (14.12).

**Інтэрв'ю з дацэнтам кафедры матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання ФПМІ Сяргеем Кашкевічам – адным з аўтараў адукацыйных стандартаў па інфарматыцы для школьнікаў** – "Настаўніцкая газета" (13.12).

**Дні адкрытых дзвярэй** – naviny.by (12.12), tut.by (11.12), "Минск-новости" (11.12).

**Пагадненне аб супрацоўніцтве БДУ з Харбінскім політэхнічным універсітэтам** – БелаПАН (06.12).

**IX Рэспубліканскі турнір юных матэматыкаў** – БелаПАН (06.12), "Настаўніцкая газета" (13.12).

**Фэстываль творчасці замежных студэнтаў "F-Art.by"** – "Вечерний Минск" (11.12), "Звязда" (14.12).

**Выстава-кірмаш "Каменная казка"** – БелТА (03.12), "Минск-новости" (03.12).

**Выхад каманды БДУ ў фінал сусветнага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў** – БелаПАН (29.11), open.by (29.11), naviny.by (29.11); tut.by (30.11), "Настаўніцкая газета" (11.12), "Звязда" (23.11; 07.12); "Народная газета" (06.12), "Знамя юности" (05.12).

**Вытворчасць комплекснага энтэрасарбенту новага пакалення "Дыясарб-гель"** – БелТА (06.12).

**Біржа-семінар у БДУ па новых тэхналогіях у сельскай гаспадарцы** – БелТА (26.11), БелаПАН (27.12), "Настаўніцкая газета" (04.12), "Рэспубліка" (27.11).

**Удзел навукоўцаў БДУ ў палярнай экспедыцыі** – open.by (01.12), naviny.by (27.11).

**Выстава "Кітай – погляд знутры. Іншы вецер"** – БелаПАН (03.12), naviny.by (03.12).

**Конкурс рэфератаў і сачыненняў Інстытута тэалогіі БДУ "Жыццё ў адказнасці за тварэнне"** – "Беларусь сегодня" (05.12).

**Пра мерапрыемствы да 160-годдзя беларускай польскамоўнай паэткі Зоф'і Манькоўскай, арганізатарамі якіх выступіў БДУ і Інстытут імя Янкі Купалы НАН Беларусі** – "Настаўніцкая газета" (22.11).

**МДУ імя А. Куляшова ў гасцях у БДУ** – "Настаўніцкая газета" (29.11).

**Знак якасці – Ліцэю БДУ** – "Настаўніцкая газета" (11.12).

**Пра студэнтку філфака Вераніку Сташулёнак** – "Настаўніцкая газета" (11.12).

**Пра перамогу каманды БДУ ў спартакіядзе ВНУ сталіцы** – "Звязда" (23.11), "Минский курьер" (24.11), "Минск-новости" (23.11).

**"Студэнт-бізнэсмэн" (пра студэнта ФПМІ Максіма Осіпава)** – "Звязда" (23.11).

**VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай"** – "Літаратура і мастацтва" (23.11).

**Парады студэнтам-першакурснікам ад педагога-псіхолага інтэрната № 3 БДУ Алены Рэйс** – "Знамя юности" (23.11).

**Творчасць студэнта ФПМІ Аляксея Крушынскага** – "Вечерний Минск" (27.11).

**Студэнт хімфака БДУ Андрэй Юхнік адказвае на пытанні пра нормы жыцця ў інтэрнатах ВНУ** – "Белгазета" (03.12).

**Прэзентацыя гістарычнага факультэта БДУ** – "Репетитор" (№ 12, 2007).

**Музей землязнаўства** – "Репетитор" (№ 12, 2007).

**Матэматыка на ўступных іспытах у БДУ** – "Репетитор" (№ 12, 2007).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі, функцыянальнага аналізу, тэорыі функцый, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, ураўненняў матэматычнай фізікі, гісторыі Расіі, філасофіі і метадалогіі навукі, гісторыі журналістыкі і літаратуры, замежнай журналістыкі і літаратуры, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, канстытуцыйнага права.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.**

**ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ "ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ" БДУ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад**

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: нацыянальнай культуры і турызму, міжнацыянальных камунікацый;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ прыродазнаўства.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 505б; тэл. 209-52-94.**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ сацыяльнай работы.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў ДзІКСТа; тэл. 210-01-10.**

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**
**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў студзені–лютым 2008 г. выкладчыкаў і спецыялістаў установ адукацыі на наступных напрамках:**

асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы ва ўмовах інавацыйнай дзейнасці (для работнікаў-кіраўнікоў і спецыялістаў ВНУ) – 14.01–25.01;

тэндэнцыі развіцця гуманітарнай адукацыі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ і інш.) – 14.01–20.06 (2 разы на месяц);

замежная мова (англійская мова) як аснова сацыяльнай і дзелавой камунікацыі сучаснага спецыяліста (для ПВС і вучэбна-дапаможнага персаналу) – 14.01–21.03 (2 разы на тыдзень);

студэнцкая моладзь і здаровы лад жыцця (для куратараў студэнцкіх груп, спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) – 14.01–18.01 і 04.02–08.02;

сучасныя аспекты вывучэння беларускай мовы і літаратуры (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) – 28.01–08.02.

**На перападрыхтоўку з прысваеннем кваліфікацыі "Менеджэр у сферы адукацыі":**

менеджмент устаноў прафесійнай адукацыі (для кіраўнікоў і спецыялістаў ВНУ, ССНУ) – 14.01.2008–1.12.2009.

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы браць удзел у курсах, тэлефануйце па нумарах 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы. Наш адрас: 220007 г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 320; тэл/факс 200-25-51.**

## КОНКУРСЫ

***Тыдзень таму былі падведзены вынікі конкурсу "Найлепшы маладзёжны праект" сярод студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ. У параўнанні з мінулым годам колькасць заявак павялічылася з 14 да 19. Грашовы фонд таксама ўзрос і зараз складае 10 млн руб.***




# НАЙЛЕПШЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ПРАЕКТ

Сярод арганізацый перамог праект Студэнцкага саюза БДУ "**Студэнцая лабараторыя творчасці**", кіраўнік – Настасся Гвардыян, студэнтка V курса механіка-матэматычнага факультэта, старшыня Студсаюза.

На другім месцы аказаліся адразу два сумежныя праекты – "**Маладзёжная ліга нацый БДУ**" ГА БРСМ (Кацярына Альшэўская, I курс факультэта міжнародных адносін) і "**Міжуніверсітэцкі фестываль нацыянальных культур**" Студэнцкага гарадка БДУ (Юлія Санько, III курс эканамічнага факультэта).

Трэцяе месца таксама падзялілі дзве праграмы. Гэта зноў-такі праекты Студэнцкага саюза БДУ пад назвай "**Мая школа**" (Святлана Грыгеліс, IV курс механіка-матэматычнага факультэта) і "**Годнае дзяцінства**" Студэнцкага гарадка (Уладзімір Бандарэнка, V курс гістарычнага факультэта).

Як відаць, для большай эфектыўнасці некаторыя праекты вырашылі аб'яднаць у адзін.

Асобны конкурс быў і сярод факультэцкіх праектаў. Першае месца не далі нікому, а другое атрымаў творчы праект фізічнага факультэта "**Абуджэнне: Мастацкая фатаграфія як элемент арттэрапіі**" (Сяргей Паўлаў, IV курс).

Трэцім месцам адзначаны "**Студэнцкі інфармацыйна-аналітычны цэнтр механіка-матэматычнага факультэта**" (Вераніка Малько, III курс).

Паглядзім, што ж уяўляе сабой праект-пераможца "Студэнцкая лабараторыя творчасці".

Яго сутнасць – стварэнне новай арганізацыйнай структуры ў рамках Студсаюза БДУ, якая будзе складацца з клубаў, студый і гурткоў па інтарэсах, дзе мяркуюць займацца творчай дзейнасцю ў сферы маркетынгу адукацыйных паслуг БДУ. У ёй запланаваныя некалькі аддзелаў: за *маркетынгавым аддзелам* замацавана аналітычная работа па вывучэнні рынку адукацыйных паслуг, сучасных тэхналогій і арганізацыя тэматычных майстар-класаў і трэнінгаў; *інфагрупа "Студэнты-абітурыенты"* стане рыхтаваць інфармацыйныя буклеты, брашуры, даведнікі, памяткі і г. д. у дапамогу школьнікам і выпускнікам, а таксама студэнтам малодшых курсаў БДУ па розных пытаннях вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці. Першай ластаўкай у гэтай рабоце можна лічыць выдадзены дапаможнік "Даведнік маладога старасты".

Усіх знаўцаў мастацтва запрашае да сябе *фотастудыя "Жыццё – цудоўнае"*, якая будзе ладзіць конкурсы і выставы фотаработ, навучаць фотамастацтву з прыцягненнем прафесіяналаў. На факультэтах плануецца арганізаваць перасоўную фотавыставу "Дзеці і дзіцячае", а таксама правесці шэраг фотаконкурсаў "Мой свет – БДУ".

Калі словы "жывапіс", "ландшафт" вам не чужыя, то накіроўвайцеся ў "Студыю дызайну". Тут будуць распрацоўвацца дыпломы, афішы, запрашальныя квіткі, афармляцца друкаваныя выданні. Менавіта тут "нарадзілася" агульная стылістычная канцэпцыя мерапрыемстваў да святкавання 86-годдзя універсітэта "Я люблю БДУ", а таксама трохгоддзя гуманітарнага факультэта "The Gumfaculty awards. The Oscar ceremony"; таксама тут распрацавалі дызайн згаданага дапаможніка для старастаў, прыдумалі сертыфікаты і эмблемы выязнога адукацыйнага семінара для маладых лідараў "Ты STARаста". Неўзабаве пачнуць выраблясць сувенірныя флікеры з сімволікай БДУ, распрацоўваць дызайнерскае афармленне "Зімовай школы студэнцкай журналістыкі".

*Студыя саломапляцення "Маё сонца"* зоймецца сувенірнай прадукцыяй, а *"Філасофскі гуртоқ"* – вывучэннем культурных традыцый Захаду і Усходу, асаблівасцяў беларускай культурнай традыцыі. Акрамя таго, распачнуць сваю дзейнасць *"Тэатр пластыкі БДУ"* і *"Студыя музычнай творчасці"*, у бліжэйшых планах якой – конкурс "Спяваю пра цябе, БДУ" і выхад дыска "Найлепшыя песні пра БДУ".

Вось такія цікавыя задумы рэалізуюцца ў сценах альма-матэр!

Студэнты, чухайце патыліцы, грызіце асадкі, занатоўвайце ідэі, прыдатныя да ўвасаблення, і падавайце іх на наступны конкурс.

**Настасся ПЯТРОВІЧ**

## ВІНШУЕМ!

# ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ "САЦЫЯЛОГІЯ"

***Навукова-тэарэтычнаму часопісу "Сацыялогія", заснавальнікам якога з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт, споўнілася 10 гадоў.***

З гэтай нагоды ў апошнія дні лістапада прайшло пашыранае пасяджэнне рэдкалегіі і круглы стол з удзелам вядомых айчынных і замежных вучоных.

Часопіс "Сацыялогія" з'яўляецца адзіным у нашай краіне перыядычным спецыялізаваным выданнем і мае высокі рэйтынг сярод прафесіяналаў не толькі ў нашай краіне, але за і яе межамі.

Галоўны рэдактар – вядомы сацыёлаг, член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Аляксандр Данілаў адзначыў у юбілейным нумары, што ўзрастаючая год ад году значнасць сацыялогіі заключаецца ў яе здольнасці бачыць будучае. Па яго словах, сёння мы жывём якраз у такі час, калі грамадству неабходны новыя сацыяльныя тэорыі, канцэпцыі, ідэі, і часопіс "Сацыялогія" становіцца пляцоўкай для іх апрабацыі. Разам з тым, вялікая ўвага надаецца зместу і тэматыцы артыкулаў, аўтарамі якіх выступаюць аўтарытэтныя і таленавітыя маладыя даследчыкі.

Акрамя таго, важным складальнікам поспеху выдання стала яго міждысцыплінарнасць, бо тут нароўні з уласна сацыёлагамі шырока прадстаўлены і філосафы, і палітолагі, і гісторыкі, а таксама вучоныя іншых спецыяльнасцяў, якія закранаюць самае шырокае кола фундаментальных сацыялагічных праблем.

У міжнародны рэдакцыйны савет часопіса "Сацыялогія" ўваходзяць навукоўцы Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Галандыі і Вялікабрытаніі.

Падчас урачыстасцяў з віншавальнымі словамі ў адрас часопіса выступіў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў. Ён адзначыў, што кіраўніцтва універсітэта пастаянна ўзаемадзейнічае з сацыялагічнымі службамі. Апытанні студэнтаў часта дазваляюць паставіць дакладны дыягназ усёй адукацыйнай сістэме, выявіць праблемы, якія існуюць у выкладанні.

Сёння сацыялогія як навука вывучаецца на ўсіх факультэтах БДУ. Яна прадстаўлена такімі спецыялізацыямі, як тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі, сацыялогія кіравання, сацыяльныя камунікацыі. Па словах рэктара, калі да існуючых дададуцца такія напрамкі, як рэклама, маркетынг, сацыяльныя тэхналогіі, якія вельмі запатрабаваныя ў краіне, то можна будзе стварыць асобны сацыялагічны факультэт. Пакуль жа ў БДУ, Гродненскім і Магілёўскім універсітэтах ёсць толькі аддзяленні сацыялогіі.

У госці да юбіляраў завіталі член-карэспандэнт РАН, доктар філасофскіх навук і галоўны рэдактар расійскага часопіса "Сацыялагічныя даследаванні" Жан Тошчанка і намеснік дырэктара Інстытута сацыялогіі НАН Украіны, доктар філасофскіх навук, галоўны рэдактар украінскага часопіса "Сацыялогія: тэорыя, метады, маркетынг" Яўген Галаваха. Яны зазначылі, што часопіс БДУ "Сацыялогія" з'яўляецца сур'ёзным акадэмічным навуковым выданнем, якое ў значнай ступені спрыяе развіццю самой навукі.

**Ганна ЛАГУН**

# 10 ГАДОЎ ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ!

***Месца сустрэчы нельга змяніць – ізноў САК "Брыганціна"! Выязны семінар-практыкум "Каардынацыйнаму савету студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ 10 гадоў. Органы студэнцкага самакіравання – погляд у будучыню".***




10 гадоў для арганізацыі – перыяд невялікі, але калі ўлічыць, што тэрмін паўнамоцтваў савета – 1 год, то за гэты час змянілася некалькі пакаленняў. Каардынацыйны савет (КС) таксама значна ўзрос, насталеў і задумаўся над далейшым сваім развіццём. Які лёс чакае органы студэнцкага самакіравання? Каб адказаць на гэтае і іншыя пытанні, а таксама адсвяткаваць з сябрамі дату стварэння КС, на выязны семінар сабраліся прадстаўнікі ўсіх маладзёжных арганізацый БДУ.

Канцэрты, танцавальныя праграмы, псіхалагічная гасцёўня, спартландыя змянялі адно аднаго, прымушалі жыць іх удзельнікаў у паскораным тэмпе. Аднак для студэнтаў, якія патрапілі ў сваю стыхію, гэта быў адпачынак. Па-сапраўднаму сур'ёзная праца вялася на секцыях, дзе абмяркоўваліся няпростыя тэмы, але ніхто не застаўся абыякавым.

Так, на секцыі "Органы студэнцкага самакіравання – погляд у будучыню" праходзіла дыскусія аб перспектывах узаемадзеяння маладзёжных арганізацый, аб неабходнасці адзінага каардынуючага органа.

На секцыі "Паспяховы старт: садзейнічанне ў працаўладкаванні выпускнікоў БДУ" быў прадстаўлены студэнцкі праект, які прадугледжвае эфектыўную кадравую палітыку і дапамогу маладым спецыялістам у рэалізацыі іх творчага і прафесійнага патэнцыялу.

Мэтай псіхалагічнага трэнінгу "Уводзіны ў коўчынг" з'яўлялася развіццё асобы, павышэнне самаацэнкі студэнтаў. Уменне весці за сабой людзей, дабівацца пастаўленых мэтаў – каштоўныя якасці, якія патрабуюць вялікай працы над уласнай асобай.

Ролевая гульня "Складаны выбар" вучыла давяраць адзін аднаму, дасягаць поспеху, не шкодзячы блізкім людзям.

Напружаная праца ў секцыях дапамагла ўдзельнікам згуртавацца, болей даведацца пра сяброў і пра сябе. На тры дні "Брыганціна" стала цэнрам маладзёжнага жыцця альма-матэр і энергетычным асяродкам новых ідэй. На закрыцці рэктар БДУ Васіль Стражаў асабіста павіншаваў Каардынацыйны савет з дзесяцігоддзем. На зваротным шляху ўсім падалося, што аўтобусы ехалі ў Мінск надта хутка, не дазволіўшы "абгаварыць" мінулыя выходныя. Студэнты не хацелі развітвацца з новымі знаёмымі і сябрамі і спадзяваліся на хуткую сустрэчу.

**Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ,**
**Ганна БЯЛОВА**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ШАНАВАННЕ ЗНАКАМІТАСЦЯЎ

***27 лістапада па ініцыятыве хімічнага факультэта адбыўся адмысловы навуковы семінар пад назвай "Дні гісторыі і навукі", прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння знакамітага акадэміка Мікалая Вавілава.***

Семінар меў междысцыплінарны характар, бо ў ім прынялі ўдзел не толькі хімікі, але і біёлагі, географы і нават навукоўцы-медыкі, а таксама супрацоўнікі НАН Беларусі. Арганізатары паставілі перад сабой даволі складаную задачу: расказаць пра багатую навуковую спадчыну Мікалая Вавілава з пагляду сучасных навуковых адкрыццяў і распрацовак. Мерапрыемства выклікала вялікую цікавасць у студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў БДУ – у актавай зале геаграфічнага факультэта, дзе ўсе сабраліся, не было вольных месцаў.


*Акадэмік Мікалай Вавілаў (1887–1943)*

У першай частцы з навуковымі дакладамі выступілі прафесар Алег Шадыра, член-карэспандэнт НАН Беларусі Сяргей Усанаў, прафесар Ядвіга Елавічова і іншыя вучоныя. Трывалай асновай для ўсіх паведамленняў з'явіліся адкрыцці Мікалая Вавілава. Пытанні, якія разглядаліся на семінары, закранalі шмат розных сфер. Гэта і не дзіўна, бо Мікалай Вавілаў быў майстрам навуковага сінтэзу. Значны ўнёсак ён зрабіў у развіццё кожнай з вышэйпералічаных навук.

Сапраўднай разыначкай мерапрыемства стаў дакументальны фільм "Апантанасць" пра цяжкі лёс і дзейнасць акадэміка. Дарэчы, гэтая стужка была знятая яшчэ 20 гадоў таму Беларускім тэлебачаннем па прапанове і пры ўдзеле супрацоўнікаў хімфака БДУ. Упершыню яна была паказаная на святкаванні 100-гадовага юбілея з дня нараджэння М.Вавівала. Да "Дзён гісторыі і навукі" з дапамогай студэнтаў стваральнікі фільма прафесар Алег Шадыра і акадэмік НАН Беларусі Любоў Хатылёва аднавілі стужку і прадэманстравалі ўдзельнікам згаданага семінара.

Арганізатары збіраюцца праводзіць штогод адзін–два такія семінары з нагоды памятных дат, звязаных з імёнамі навукоўцаў, якія пакінулі свой адбітак у гісторыі. Намеснік дэкана хімічнага факультэта Таццяна Савіцкая паведаміла, што на наступных семінарах будзе абмяркоўвацца навуковая спадчына знакамітага вучонага-хіміка Уладзіміра Маркоўнікава, а таксама фізіка Джона Томсана, ён жа лорд Кельвін. Ініцыятары спадзяюцца, што такія сустрэчы стануць яшчэ адной добрай традыцыяй нашага універсітэта.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

***На біялагічным факультэце з 30 лістапада па 1 снежня прайшла міжнародая канферэнцыя "Сігнальныя механізмы рэгуляцыі фізіялагічных функцый", прымеркавана я да 85-годдзя стварэння кафедраў фізіялогіі ў БДУ і БДМУ.***

# ПРЫЯРЫТЭТЫ ФІЗІЯЛОГІІ

У юбілейных мерапрыемствах бралі ўдзел выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі абедзвюх ВНУ, а таксама шматлікія госці з устаноў, якія вядуць падрыхтоўку спецыялістаў па фізіялогіі. У дакладах загадчыка кафедры нармальнай фізіялогіі БДМУ прафесара А. Кубаркі і дацэнтаў кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл біяфака БДУ І. Саладоўнікавай і Г. Захарэўскай адзначаны асноўныя этапы развіцця фізіялогіі як навукі і станаўлення педагагічнага працэсу па гэтай "нобелеўскай дысцыпліне" ў нашай краіне.

У рамках канферэнцыі зроблена 42 даклады, праведзена тры пленарныя пасяджэнні і стэндавая сесія.

Адначасова з канферэнцыяй адбыўся XII З'езд фізіёлагаў, на якім было вырашана сканцэнтраваць намаганні айчынных спецыялістаў на прыярытэтных кірунках – забеспячэнні харчовай і біябяспекі, ахове здароўя і лекавай бяспецы, экалагічнай бяспецы і адукацыі. Старшынёй Беларускага таварыства фізіёлагаў на наступны чатырохгадовы тэрмін абраны загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл БДУ А. Чумак.

**Ганна ЛАГУН**

УНІВЕРСІТЭТ

РОЗДУМ АБ ВЕЧНЫМ

# У ПОШУКУ ЖЫЦЦЁВЫХ АСНОЎ

*Чалавек сам для сябе праблема і глыбокая таямніца.*
*І ў гэтым яго веліч і яго галеча.*
*Епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім (Беланожка)*

Мы змяніліся. Мы больш не п'ем малако з трыкутных пакетаў і кефір са шкляных бутэлек, не ходзім строем і не прасуем гальштукі, баючыся прамінуць маленькую стрэлачку. Мы ўжо іншыя. Час змяніўся і ў нас саміх змянілася нешта, што прымушае сёння болей думаць пра сябе, а не пра суседа і калектыў. Але ці сталі мы больш маральнымі? І што будуць ведаць нашыя дзеці пра сяброўства, узаемадапамогу, абавязак, гонар, патрыятызм?.. Пошук адказаў на "адвечныя" пытанні клапоціць чалавека ўсё жыццё, займае яго думкі, пачуцці, жаданні і дзеянні да апошняга ўздыху. Кожны з нас, незалежна ад полу, узросту і сацыяльнага статусу, мае патрэбу ў дыялогу, які пралівае святло на пытанне пра сутнасць быцця.

Сёння шмат гавораць аб маральным крызісе моладзі. Канешне, яна ўжо зусім не тая, якая была раней, але яе нельга характарызаваць тэрмінамі "абязлічаная" і "бездухоўная".

Ці можна сцвярджаць, што адвечныя каштоўнасці ўжо не з'яўляюцца для маладых жыццёвымі арыенцірамі? У кожнага пакалення, на мой погляд, фарміруецца сваё ўяўленне пра мараль, сумленне, любоў. Кожны з нас адчувае на сабе подых часу і яго ідэалаў. Папулярныя гадоў дваццаць таму, сёння яны ўжо неактуальныя (як і тая ж вопратка, абутак). Аднак ёсць і фундаментальныя рэчы. Змяняюцца не самі каштоўнасці, а іх напаўненне, той сэнс, які мы ў іх укладаем. Нельга адмаўляць, што сучасная моладзь "больш практычная" (яна ж жыве ў спажывецкім грамадстве!), чорствая і нават цынічная. Не будзем абагульняць гэты тэзіс. У розныя гістарычныя эпохі не ўсяму і не заўсёды спадарожнічала духоўнасць і высокая мараль. "Залатыя" часы не трэба ідэалізаваць. Але, безумоўна, сённяшні век кідае чалавецтву рашучы выклік. І не многія яго адольваюць. Аднак у лепшай частцы моладзі ўсё яшчэ застаецца стойкае імкненне да самаўдасканалення на аснове духоўна-маральных традыцый.

Як вядома, у нашым універсітэце ладзяцца сустрэчы студэнтаў з выбітнымі асобамі, да слоў якіх моладзь прыслухоўваецца. Найбольш рэгулярна такія мерапрыемствы праводзяцца на юрыдычным факультэце, дзе працуе ініцыятыўная загадчыца музея Лідзія Максімава. Спецыфіка абранай прафесіі часта сутыкае будучых прававедаў з праблемамі людзей, з цяжкімі і супярэчлівымі жыццёвымі сітуацыямі. Ужо на першых семінарах ім прапаноўваюцца на разгляд розныя казусы з далейшым наведваннем калоній, ізалятараў, практыкуецца работа ў "Юрыдычнай клініцы" – усё гэта садзейнічае развіццю думак пра недасканаласць навакольнага свету і павышанаму ўнутранаму жаданню да светапазнання. Гэты пасыл знайшоў адлюстраванне ў прынцыпі Маральна-этычнага кодэксу студэнта юрыдычнага факультэта БДУ, які ўяўляе сабой сукупнасць нормаў, накіраваных "на сцвярджэнне Справядлівасці, Дабра, Гуманізму, Чалавекалюбства". Многім можа падацца, што пісьмовае замацаванне адвечных каштоўнасцяў – юрыдычная фармалістыка. Але мне здаецца, што гэта дапамагае ўпэўніцца ў наяўнасці вялікай колькасці аднадумцаў і стварае перадумовы для духоўнага і інтэлектуальнага ўзбагачэння (што доказвае папулярны форум на факультэцкім сайце).

Падмацаваннем гэтай тэндэнцыі стала сустрэча з першым прарэктарам Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы Уладыкам Серафімам, прадстаўнікамі Беларускай праваслаўнай царквы, семінарыстамі, намеснікам Паўнамоцнага па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў У. Ламекам. Гутарка мела тэму "Ці з'яўляюцца адвечныя каштоўнасці арыенцірам для сучаснай моладзі?". На ёй былі ўзнятыя пытанні выхавання дзяцей у сям'і і грамадстве, узаемаадносіны палоў, павага да гісторыі нашай краіны і інш. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі канцэпцыю свецкай дзяржавы, дыскутавалі пра неабходнасць рэлігійнага выхавання ў школе. Усе прысутныя маглі задаць не толькі хвалюючыя пытанні, але і падзяліцца сваім бачаннем той ці іншай праблемы. Студэнткі І курса Алеся Мінькова і Вікторыя Рамашко нават напісалі верш



*Айцец Аляксандр (на пярэднім плане) і Уладыка Серафім падчас размовы са студэнтамі юрфака.*

пра адвечныя каштоўнасці, урывак якога прыводзіцца ніжэй:

*Чтобы суметь не сломаться в ненастье,*
*Чтобы судьба не казалась сложна,*
*Чтобы найти свое личное счастье,*
*Нам в этой жизни надежда нужна. <…>*
*Мы молодые, но в прожитой жизни пытались,*
*Искали и все же нашли*
*Ценности высшие, мудрые мысли,*
*С которыми дальше бок о бок пошли.*

Можна з ўпэўненнасцю сказаць, што тыя, часам супярэчлівыя, думкі, ідэі, унутраныя парывы, якія ўзнікаюць пасля такіх гутарак, з'яўляюцца добрай "ежай для розуму" і стымулам для студэнтаў. Дадзены дыялог – яшчэ адна прыступка да разгадкі "глыбокай таямніцы чалавека".

А 6 снежня ў госці да юрыстаў завіталі прадстаўнікі хакейнага клуба "Юнацтва–Мінск". Размова ішла, канешне ж, пра здаровы лад жыцця. Наперадзе яшчэ шмат цікавых мерапрыемстваў!

**Людміла АРЛОЎСКАЯ**

МАЙСТРОЎНЯ

# АДРАДЖЭННЕ "ЛЕТУЦЕННІКА"

***14 снежня ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ афіцыйна ўзнавіўся пасля 20-гадовага перапынку студэнцкі тэатр-студыя "Летуценнік". Першай пастаноўкай аднаўленага калектыву стала купалаўская "Паўлінка".***

– Я сама іграла ролю Паўлінкі ў студэнцкія гады, – сказала прафесар Ірына Казакова, мастацкі кіраўнік "Летуценніка" і загадчыца кабінета-музея беларускай народнай культуры. – Да таго ж гэтым спектаклем мы завяршаем цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У пастаноўцы ўдзельнічалі студэнты І–ІІ курсаў аддзяленняў рускай, беларускай і славянскай філалогіі. Але да падрыхтоўкі далучыўся ўвесь факультэт – маладыя заўзятары малявалі дэкарацыі, дапамагалі з касцюмамі... Музычнаму афармленню пасадзейнічаў фальклорна-этнаграфічны гурт "Багач", які таксама існуе пры "Беларускай хатцы".

На імпрэзу была запрошаная заснавальніца тэатра дацэнт Маргарыта Яфімава, а таксама прадстаўнікі дэканата і акторы былых саставаў "Летуценніка". Шмат з іх ужо маюць вучоныя ступені і самі выкладаюць на філфаку.

Па заканчэнні спектакля адбылася невялічкая цырымонія ўз'яднання тых, хто ставіў "Паўлінку" яшчэ 20 гадоў таму, і ўзнагароджання сучасных актораў. Усе разам яны шчыра павіншавалі Маргарыту Яфімаву з днём народзінаў – нядаўна ёй споўнілася 80. Дэкан факультэта прафесар Іван Роўда ўручыў ёй ганаровую грамату ад рэктарата. Былыя "летуценнікі" зрабілі невялічкія памятныя падарункі маладому пакаленню. Родны дэканат таксама паабяцаў падтрымаць таленты.

У планах "Летуценніка" і "Багача" – праца над беларускімі святочнымі абрадамі. Першымі з іх плануецца паставіць вяселле.

**Аляксандр КРАСЬКО**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# КВЗ: БАРАЦЬБА ТЫТАНАЎ!

***12 снежня ў актавай зале Ліцэя БДУ прайшоў Кубак КВЗ Студэнцкага гарадка. За перамогу ў фінале змагаліся пяць наймацнейшых камандаў, якія прайшлі папярэдні адбор. Гэта калектывы "ДВД" інтэрната № 10, "Капейка" – № 1, "Барада Чака Норыса" – № 6, "Без даты" – № 2, "Рэвалюцыя" – № 4. Нагадаем, што летась кубак падзялілі каманды "адзінкі" і "шасцёркі".***

Пасля традыцыйнага конкурсу "Прывітанне" першымі апынуліся "Капейка" і "Рэвалюцыя", якія не здалі сваіх пазіцый і пасля гумарыстычнай "Размінкі". У "Капейкі" амаль кожны жарт быў вельмі трапным, часам яны нават адказвалі фразамі з прывітання, што, канешне ж, не магло не спадабацца журы. Але вось пасля хатняга задання з'явілася інтрыга. Да шэрагу лідараў падцягнулася каманда "шасцёркі", якая ўжо тройчы была пераможцай Кубку! Такога напружання гледачы, напэўна, яшчэ не адчувалі. Але аб гэтым пазней...

Некалькі слоў пра жарты. Было відаць, што ў кожнай каманды свой стыль: хтосьці паказаў міні-п'есу з касцюмамі, хтосьці проста жартаваў, хтосьці рабіў акцэнт на інтэлектуальных жартах, а хтосьці – на гульні ў цэлым. Увогуле, атрымаўся выдатны і розны КВЗ. У журы не было часу сумаваць (дарэчы, у яго склад уваходзілі двухразовыя чэмпіёны Міжнароднага саюза КВЗ Віктар Таўкач і Аляксандр Гаўрыльчык, а таксама кіраўнікі падраздзяленняў БДУ). Балельшчыкі таксама засталіся задаволенымі і выдатна падтрымлівалі свае каманды – грамчэй балеюць можа толькі падчас фіналу чэмпіянату свету па футболе. Назвы камандаў скандзіраваліся так дакладна, быццам іх рэпетавалі не адзін месяц!



*Пераможцы трыумфуюць.*

Але вернемся да нашай інтрыгі. Пасля хатняга задання, якое ў інтэрната № 6 было як заўсёды вясёлым і арыгінальным, у сэрцах балельшчыкаў пасялілася надзея на тое, што разрыў у дзевяць балаў будзе ліквідаваны. І сапраўды, дзякуючы бліскучаму заключнаму выступленню "Барада Чака Норыса" набрала 111 балаў і на 5 пунктаў апярэдзіла сваіх галоўных канкурэнтаў. Кубак нават не прыйшлося дзяліць. У выніку "Капейка" заняла другое месца. Лепшым акторам назвалі прадстаўніка гэтай жа каманды Зміцера Паўлюшчыка, вядомага пад мянушкай "Мамант", а "Барада Чака Норыса" атрымала прыз за лепшую мініяцюру. Гэта было сапраўды запамінальнае відовішча!

Віншуем "шасцёрку"! Нягледзячы на зменены склад і назву, гумар у каманды застаўся эталонным. Так трымаць!

**Максім КВЯТКОЎСКІ**

**Закончыўся чарговы рок-фестываль "Такія пернікі", вынікі якога былі падведзены 22 лістапада на гала-канцэрце ў клубе "Фартуна". Сёлета мерапрыемства ладзіла ўпраўленне па справах культуры сумесна з пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў БДУ.**

# ВОСЬ "ТАКІЯ ПЕРНІКІ"!



У конкурсе бралі ўдзел самадзейныя рок-гурты вышэйшых і сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў Мінска. Фестываль праходзіў у тры этапы. На першым, "завочным", туры адбіраўся дасланы дэмаматэрыял. Другі тур – канцэртны – праходзіў 20 і 21 лістапада ў актавай зале філфака. У ім удзельнічалі 25 калектываў, якія выконвалі па два творы. На заключны тур былі дапушчаныя 16 лепшых гуртоў. Іх майстэрства ацэньвалі вядомыя выканаўцы і спецыялісты ў галіне музыкі: Андрэй Маркуць, Кацярына Пытлева, Кірыл Шывандо, Юрый Міхайлоўскі і аўтар праекта – Аксана Чупрына.

Гледачы, якія сачылі за развіццём падзей на працягу ўсіх трох конкурсных дзён, не засталіся расчараванымі, паколькі сталі сведкамі сапраўднай інтрыгі, а пасля – цэлага россыпу прызоў. Журы спынілася на трох музычных калектывах: "Unia", "Felones De Se", "Университет", вызначыўшы іх найлепшымі ў сваіх стылістычных блоках. Акрамя таго, былі абвешчаныя пераможцы ў розных намінацыях: "Лепшая аўтарская песня" (гурт "Моцарт", "DISSIPATION"), "Артыстычнасць" (гурт "Наискосок"), "Найлепшы вакаліст" ("Наш день", "Felones De Se"), "Найлепшы гітарыст" ("Antidote"), "Найлепшы барабаншчык" ("SCANDAL"), "Камандны дух" ("Restart"), "Харызма" ("Fujito-Scale").

Усім лаўрэатам дастаўся вялікі сувенірны пернік – галоўны прыз фестывалю. Апроч гэтага, Андрэй Рыбалтоўскі ("Университет", журфак, ІІ курс), Юрый Сцепанчук ("Unia", мехмат, IV курс), Арсень Бабаеў ("Felones De Se", ФПМІ, ІІІ курс) атрымалі грашовую прэмію ад пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ. А ўсе астатнія – дыпломы ўдзельнікаў і сувенірныя майкі.

Наступны рок-фестываль адбудзецца праз год. За гэты час плануецца не толькі арганізаваць добрае відовішча, але і знайсці новыя таленты сярод моладзі. І можа быць праз пэўны час тыя ж "Unia", "Felones De Se" і "Университет" набудуць яшчэ большую папулярнасць, а ў іхніх рэзюмэ будзе значыцца: "Лаўрэаты рок-фестывалю «Такія пернікі»"...

**Алена САВІЦКАЯ**

СВЕТ ПРЫГАЖОСЦІ



# "МАДЭЛЬНАЯ" ЖУРНАЛІСТЫКА

***БДУ багаты на неардынарных асоб. У гэтым чарговы раз пераконвае Яўгенія НЯРОНСКАЯ – уладальніца тытулу "Міс Фота" міжнароднага конкурсу "Міс Універсітэт свету–2007". Яўгенія, студэнтка трэцяга курса факультэта журналістыкі, паспела заявіць пра сябе на тэлеканалах "Лад" і "СТБ", завязаць дзелавыя кантакты з газетай "Аўтабізнэс" і стаць прэс-сакратаром камітэта па драгрэйсінгу Беларусі, адзначыцца ў вядомых мадэльных агенцтвах краіны, а таксама завітаць у Японію, Кітай і Паўднёвую Карэю. Менавіта ў апошняй з азначаных краін дзяўчына была прызнаная самай фотагенічнай студэнткай свету.***

**– Яўгенія, падзяліся, як ты патрапіла на конкурс?**

– Паспрабаваць свае сілы мне прапанавала Нацыянальная школа прыгажосці. Да гэтага ўдзельнічала ў шэрагу конкурсаў, выходзіла ў фіналы, але дасягнуць перамогі не ўдавалася. Таму працягвала спаборнічаць, каб атрымаць, так бы мовіць, афіцыйнае пацвярджэнне сваёй вартасці. Змагацца за тытул у Сеул прыехала каля 50-ці студэнтак з розных ВНУ свету. У Маскве 15 рускамоўных дзяўчат (прадстаўніцы Азербайджана, Туркменістана, Малдовы, Украіны, Прыдняпроўя, Крыма і іншых краін) чакаў агент, які затым суправаджаў нас як памочнік і перакладчык.

**– Ці стаўся карысным вопыт удзелу ў конкурсах прыгажосці?**

– Досвед выступлення, уласнай дэманстрацыі, канешне, спатрэбіўся. Мадэль павінна быць вельмі дасціпнай, мусіць выпраменьваць упэўненасць, калі ідзе па подыуме. На маю думку, вучоба ў школах мадэляў не мае істотнага значэння – гэта толькі першы крок да сапраўднага прафесіяналізму. Колькі мяне ні вучылі, адчула сябе нароўне з іншымі манекеншчыцамі толькі тады, як паўгода папрацавала.

**– Сеул спадабаўся?**

– Знайшла яго вельмі падобным да Токіо. Тыя ж вялікія яркія вуліцы, тая ж складаная сетка метро – больш за дваццаць ліній, бясконцыя заторы на шашы, загазаванасць, азіяцкія твары паўсюль. У гатэлі сачылі, каб мы не выходзілі ў горад самастойна, але мне карцела наведаць адно тамтэйшае мадэльнае агенцтва. Фінал конкурсу скончыўся раніцай а пятай, а ў сем я ціхенька збегла з нумара, насунуўшы ніжэй капялюш, – выйшла займальная вандроўка.

**– Падчас конкурсу ты брала ўдзел у дабрачыннай дзейнасці. Якая акцыя найбольш запомнілася?**

– На досвітку мы басанож узнімаліся на гару разам з трохгадовымі карэйскімі дзецьмі. З аднаго боку, навокал было вельмі прыгожа, з другога – паспрабуйце пры 15-ці градусах вышэй за нуль ісці па вострых камянях – не здзівіцеся, чаму многія канкурсанткі абуральна праклёны на галовы арганізатараў.

**– Еўропа змагаецца за новыя стандарты мадэльнай знешнасці, уводзіць індэкс масы цела... Што думаеш на гэты конт?**

– На конкурсе "Міс Універсітэт свету" было многа дзяўчат "немадэльнай" знешнасці, напрыклад, агульная фаварытка і любіміца арганізатараў, Бразілія. Усе былі ўпэўненыя, што гэтае абаяльнае дзяўчо пераможа – а яна атрымала толькі прыз глядацкіх сімпатый. Журы аддала перавагу самым худзенькім і высокім. І гэта, я лічу, правільна. Закон сцэны, подыума – доўгае выглядае лепей. Калі ад нараджэння маеш астэнічны склад, ты высокая і худая – табе прамы шлях у мадэльны бізнэс. У іншых выпадках проста не варта сябе марнаваць дыетамі. Я ж, між іншым, кожны дзень з'ядаю па плітцы шакалада і закусваю булачкай.

**– Якім жа чынам форму падтрымліваеш, мо спортам займаешся?**

– Па праўдзе, я вялікая лайдачка. Адзіны спорт, які мяне вабіць – конны. Быў перыяд, калі амаль не пакідала сядла. Ад напружання ногі трэсліся, тады і пахудзела, і ўсе мышцы "падцягнуліся". Шматкроць падала, але пасля кожнага падзення раскаскалася назад, каб давесці каню і сабе, што болей ён мяне не скіне.

**– Гэтым летам ты перавялася на завочную форму навучання. Чаму?**

– У мінулым годзе даводзілася часта прапускаць заняткі, каб паспець з працай на "Сталічным тэлебачанні". Калі туды ўладкоўвалася, збіралася працаваць на палову стаўкі, то-бок 4 гадзіны ў дзень. Але выявілася, што гэтага недастаткова, каб падрыхтаваць добры сюжэт для навін – знайсці тэму, дамовіцца з патрэбным чалавекам, з'ездзіць на месца, пасля напісаць тэкст, змантіраваць, агучыць... Сутыкнулася на тэлебачанні з такой непрыемнасцю: тыя, хто бачыў мае фотаздымкі на часопісных вокладках ці рэкламных бордах, не ўспрымалі ўсур'ёз як журналіста – маўляў, мадэлька хоча "засвяціцца" ў кадры. Са стэрэатыпамі змагаюся, прымушаю людзей зразумець, што і такая ж карэспандэнтка, і ў штат патрапіла пасля добрасумленнага праходжання практыкі на канале, а не, выбачайце, праз чыйсьці ложак.

**– Будучыню звязваеш з журналістыкай ці з мадэлінгам?**

– Праца мадэлі – гэта хобі. У нашай краіне яна не можа прынесці такога сур'ёзнага прыбытку, як у Японіі, Францыі, Італіі. Журналістам хацела стаць са школьных часоў. Унікнуць у незнаёмы свет, чужую прафесію, выхапіць адтуль самае цікавае і сысці – журналісцкі лад жыцця мне вельмі даспадобы.

**– Ты прадстаўляла не толькі нашу краіну, але і яе вядучы універсітэт. Што для цябе БДУ?**

– На конкурсе ўсе дзяўчаты атрымалі заданне апісаць альма-матэр. Каб я вучылася ў іншай установе, якая існуе некалькі гадоў, было б значна цяжэй уразіць журы. А БДУ – гэта каласальная арганізацыя са шматгадовай гісторыяй, традыцыямі, пра што можна распавядаць гадзінамі.

Гутарыла
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

НА ЗАМЕТКУ

## У ПАДАРОЖЖА!

У структуры БДУ на базе Інстытута бесперапыннай адукацыі функцыянуе турыстычнае агенства **"UNIVERSUM"**, асноўнай задачай якога з'яўляецца аказанне турыстычных паслуг студэнтам і выкладчыкам.

Студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у міжнародных адукацыйных праграмах па розных профілях і з вывучэннем замежных моваў.

Для выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ прапануецца адпачынак і аздараўленне ў Беларусі, Расіі, Украіне, Кіпры, Егіпце, Турцыі, Балгарыі, Румыніі, ААЭ, Тайландзе, Індыі, Іарданіі, В'етнаме – паўсюль, дзе сонца, мора і пясок!

Акрамя таго, ладзяцца ўсялякія экскурсіі па Рэспубліцы Беларусь, а таксама пазнавальныя турыстычныя маршруты па Залатым кальцы Расіі, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Літве, Польшчы, Чэхіі і г. д.

Увага, навінка! У выкладчыкаў і студэнтаў ёсць магчымасць адправіцца на Новы год у Музей прыроды Белавежскай пушчы з наведваннем рэзідэнцыі Дзеда Мароза, а таксама ў этнаграфічны комплекс гісторыка-культурнага запаведніка "Заслаўе" на калядныя абрадавае свята з паказам батлеечнага спектакля.

Напоўніце ваша жыццё ўражаннямі ў пазнанні свету разам з турыстычным агенствам "Universum"! Ласкава запрашаем!

**Наш адрас: вул. Кастрычніцкая, 4а – 403. Тэл/факс: (017) 206-64-51, 209-52-89. *E-mail: universym@tut.by***

ВЕДАЙ НАШЫХ!

***Студэнцкі саюз БДУ абвешчаны найлепшым моладзёжным аб'яднаннем па выніках агляду-конкурсу "Лідар года–2007", падведзеных 17 снежня адміністрацыяй Маскоўскага раёна г. Мінска.***



# НОВАЯ ПЕРАМОГА МОЛАДЗІ БДУ

У конкурсе бралі ўдзел прадстаўнікі моладзёжных арганізацый і аб'яднанняў, працоўных і творчых калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама прыватныя асобы да 31-го года, якія займаюцца рэалізацыяй дзяржаўнай моладзёжнай палітыкі.

За сваю перамогу прадстаўнікі Студсаюза БДУ атрымалі тэлевізар "Гарызонт". Яго адразу ж вырашылі перадаць дзіцячаму дому № 8 г. Мінска, з якім шчыльна супрацоўнічаюць.

Старшыня Студэнцкага саюза БДУ Настасся Гвардыян адзначыла: "Перамога з'яўляецца для нас заканамернай, аднак не менш прыемнай і радаснай. Сапраўды гэты год стаў для нашай арганізацыі эпахальным. Мы здолелі выйсці на новы ўзровень работы, значна павялічыць колькасць студэнтаў у сваіх шэрагах, пашырыць кірункі дзейнасці арганізацыі. Пры падрыхтоўцы да конкурсу мы без цяжкасцяў аформілі дзве агромністыя папкі з метадычнымі матэрыяламі паводле мерапрыемстваў, праведзеных сёлета: "Капуснік"; фотаконкурс "Дзеці і дзіцячае"; удзел у арганізацыі святочнай шоу-праграмы "Я люблю БДУ", прымеркаванай да 86-годдзя універсітэта; выязны адукацыйны семінар для старастаў вучэбных груп І курса "Ты $TARаста"; студэнцкую бізнэс-канферэнцыю "Брыз"; міжнародны круглы стол, прысвечаны супрацоўніцтву студэнцкіх арганізацый і рэалізацыі сумесных праектаў у рамках Дзён студэнта ў БДУ; факультэцкія конкурсы прыгажосці і інш. У "метадычнай капілцы" Студсаюза з'явілася шмат новых цікавых і папулярных сярод студэнтаў напрамкаў дзейнасці: праграма "Эканамічная культура", праект "Мая школа" (дабрачынная педагагічная работа са школьнікамі і выхаванцамі дзіцячых дамоў), праграма "Традыцыі", праект "Лабараторыя студэнцкай творчасці" і інш.

Хачу выказаць глыбокую ўдзячнасць кіраўніцтву універсітэта і асабіста прафесару Васілю Стражаву за дапамогу, падтрымку ўсіх ініцыятыў, паразуменне і жыццёвыя парады.

Вялікі дзякуй тым студэнтам, якія разам са мной імкнуліся зрабіць жыццё БДУ ярчэйшым. Віншую ўсіх з надыходзячым Новым годам і жадаю поспехаў!

**Антон САСНОЎСКІ**

# НАШЫ ЕДУЦЬ У КАНАДУ!

***Каманда факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ стала адзіным беларускім прадстаўніком, які выйшаў у фінал Чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў па правілах АСМ.***

Нашы студэнты занялі VI месца на паўфінальных спаборніцтвах Паўночна-Усходняга рэгіёну, што прайшлі 28 лістапада ў Санкт-Пецярбургу, і заваявалі права ўдзельнічаць у заключным этапе. Усяго на гэтай адборачнай стадыі бралі ўдзел 198 універсітэцкіх калектываў з Расіі, Беларусі, Латвіі, Літвы, Казахстана, Грузіі, Арменіі, Кіргізіі і Узбекістана. Ад нашай краіны выступалі студэнты БДУ, БДУІР і Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Паводле правілаў спаборніцтваў каманда з 3-х чалавек за 5 гадзін павінна рашыць як мага болей задач (у прапанаваны спіс уключаецца ад 8-мі да 12-ці задач) за найменшы час. Для гэтага ўдзельнікам неабходна распрацаваць матэматычную мадэль, прыдумаць алгарытм, запраграмаваць яго, праверыць на ўсіх дапушчальных наборах даных. Праверка рашэнняў ажыццяўляецца аўтаматызаванай сістэмай на распрацаваных кампетэнтным журы наборах даных, колькасць якіх даходзіць да сотні. Для рэалізацыі сваіх праграм камандзе даецца адзін кампутар, таму ўсе ўдзельнікі павінны працаваць зладжана, падзяляючы паміж сабой паслядоўнасць дзеянняў. Гонар БДУ з поспехам абаранілі Мікіта Леснікоў, Павел Іржаўскі і Уладзімір Керус, якія раней перамаглі ў 1/8 фіналу гэтых спаборніцтваў, арганізаваных 30 верасня на базе нашага універсітэта. Цяпер іх чакае фінал, што адбудзецца ў красавіку 2008 года ў канадскім горадзе Альберта.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

# АЛІМПІЯДА ПА АСТРАНОМІІ

**2 срэбныя і 3 бронзавыя медалі атрымала каманда БДУ на Першай міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы, якая праходзіла ў пачатку снежня ў горадзе Чыанг Май Каралеўства Тайланд.**

Наша каманда складалася з чатырох студэнтаў І курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (Сяргей Малюцін і Юрый Агейчык – уладальнікі "срэбра", а Яўген Доўнар і Рыгор Іваноў – "бронзы") і іх аднакурсніка з фізічнага факультэта (Аляксей Галаванаў – "бронза"). Усе хлопцы – лаўрэаты і прызёры Рэспубліканскай алімпіяды навучэнцаў па астраноміі 2007 года. Дарэчы, першыя тры ўдзельнікі з'яўляюцца выпускнікамі Ліцэя БДУ гэтага года. Каб патрапіць у склад беларускай каманды ўсе кандыдаты мусілі прайсці тры складаных адборачных туры. Падрыхтоўка каманды ажыццяўлялася супрацоўнікамі творчага калектыву Абсерваторыі БДУ Аляксандрам Паплаўскім, Мікалаем Стацюкевічам і Альгердам Кузнечыкам.

Акрамя беларусаў, у алімпіядзе ўдзельнічалі яшчэ 20 камандаў з розных краін свету.

**Вераніка БУТА**

## ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Інтэрв'ю з удзельніцай конкурсу "Міс Сусвет–2007" Алёнай АЛАДКА, а таксама іншыя матэрыялы, якія не трапілі ў нумар, чытайце на сайце нашага выдання www.bsu.by**

## З УСМЕШКАЙ

Разважаюць дзве студэнткі:
– Слухай, – пытаецца першая, – сёлета Новы год на які дзень тыдня прыпадае?
– Пятніца, – адказвае другая.
– Ой! Толькі б не 13-е!!!

– Прывітанне! Як прайшла сустрэча Новага года?
– Ой, не ведаю, яшчэ не расказвалі!

Аб'ява ў аўтасалоне: "Навагодні распродаж. Прадаецца два «Ролс-Ройсы», «Мэрсэдэс-600» і «Лінкольн» са скідкай 5 %, пенсіянерам і студэнтам скідка 10 %".

Студэнт суседу па пакоі:
– А якое сёння чысло?
– 2-га студзеня.
– А што, 1-га не было?!

Памятка студэнту: "Неўзабаве Новы год. Час мыць шкарпэткі і мяняць лязо ў аднаразовай брытве".

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

21 снежня 2007 года
Падпісана да друку 19.12.2007 г.
Зак. 1313. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by